PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 47 (2480) Год XLVIII | Беласток, 23 лістапада 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Еўрапейскія варштаты

Мацей Халадоўскі

— Во, глядзі, прыехала файная пані міністр! — гукнуў рабочы з лапатай да калегі пад беластоцкай Вышэйшай школай фінансаў і кіравання на від выходзячай з БМВ Дануты Гюбнэр. — А мне што там... Пайшлі капаць! — пачуў у адказ.

Міністр па еўрапейскіх справах зараз пасля гаварыла да тлуму студэнтаў і гасцей вучэльні аб сітуацыі Польшчы паўгода да ўваходу ў Еўрасаюз.

— У гэты майскі дзень будучага года не заўважым ніякай розніцы паміж Польшчай, якая была дагэтуль, а тою, якая будзе ў Еўрасаюзе, — пачала прафесар Гюбнэр.

Зараз потым падкрэсліла, што найцяжэйшым ад 1994 г. (дата заявы Польшчы аб хадайніцтве ў ЕС) было прыстасаванне права да еўрасаюзных стандартаў. Да гэтай пары ўдалося змяніць блізка 400 законаў. Засталося яшчэ трынаццаць.

І далей:

— Маем цяпер цалкам старэючую Еўропу. Некаторыя краіны ўжо не ў змозе запрацаваць на ўласныя пенсійныя фонды. Таму дыскутуецца аб міграцыйнай палітыцы. Будзе ў Еўропе ўзрастаць запатрабаванне на рабочую сілу, добра адукаваную. Трэба, значыць, слядзіць за тэндэнцыямі ў паасобных краінах.

Прытым міністр зазначыла:

— У сённяшніх краінах ЕС няма такое, як у Польшчы, цягі да хуткага здабывання добрай адукацыі. Мабыць, таму ўяўляюць нас як нацыю спантанна арыентуючуюся на канкрэтныя дзеянні. Аднак, важна, каб адукацыя, спецыяльнасці, былі звязаны з патрэбамі рынку працы.

На адно з пытанняў маладога чалавека, які прызнаўся, што валодае некалькімі мовамі, скончыў два факультэты за мяжой і не можа знайсці працы, міністр Гюбнэр адказала:

— У мае рукі трапляюць дзесяткі заяў ад маладых людзей, якія валодаюць трыма-чатырма мовамі. Але мая ўстанова не мае штатаў. Аднак, цікава, што ёсць значная група моладзі, якая хоча працаваць у публічнай адміністрацыі. Ёсць, аднак, іншыя магчымасці. Трэба прымаць удзел у конкурсах на працу ў еўрапейскіх структурах. Сёння працуе ў іх каля трохсот, галоўным чынам маладых людзей (Савет Еўропы, Парламент, Еўрапейскі сакратарыят і г.д.).

На думку міністр Дануты Гюбнэр, шанц для моладзі — гуртаванне ў свайго роду двух-трохасабовыя фірмы, якія будуць дапамагаць у апрацоўванні рознага роду фармальнасцей неабходных для здабывання грошай з Еўрасаюза.

[працяг ☞ 2]

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Мясакамбінат „Рольмак плюс" перад ліквідацыяй

Неплацежаздольны „Рольмак плюс"

Аляксей Мароз

Гаспадары, што раней прадавалі збожжа і свіней у Макаўцы, пачалі разважаць, ці не абанкруціўся сельскагаспадарчы кааператыў з гэтай вёскі. Мясакамбінат прадпрыемства, які раней уваходзіла ў склад Сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва „Рольмак" у Макаўцы, перастаў плаціць гаспадарам за пастаўленую імі свініну, а пасля не заплаціў сваім работнікам.

Па дарозе ў Макаўку бачу камбайны, якія ўбіраюць цукровыя буракі. На кааператыўным панадворку стаяць машыны і ляжыць вялікая куча кукурузнага зерня. Паміж будынкамі ходзяць работнікі. У офісе пажылы гаспадар хоча купіць парасяты. Відаць, што Макаўскі сельскагаспадарчы кааператыў яшчэ дзейнічае.

Кааператыў працуе нармальна

— Хаця выдаем зарплату толькі за верасень, то кааператыў працуе нармальна. Выконваем раней намечаныя планы і пагрозы банкруцтва няма. Фінансавыя ўмовы таксама нядрэнныя. Прыбытак ад продажу буракоў і кукурузы атрымаем ажно ў снежні і таму замарудзіліся мы з зарплатамі. Ёсць запасы збожжа. Аднак шкада зараз яго прадаваць, калі цана яго невялікая, — заяўляе Віктар Рэент, старшыня ўправы Сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва „Рольмак" з Макаўкі. Да горшага фінансавага становішча кааператыва спрычыняецца свінагадоўля. Паколькі цана на свініну вельмі панізілася, прадаваць яе прыходзіцца ніжэй сабекошту. З продажам быдла стрымаліся, бо цана на яго панізілася яшчэ больш чым на свініну.

Змены ў Макаўцы

Раней жывёла з сельскагаспадарчага кааператыва пераробілася на мяса ў мясцовым мясакамбінаце. Гэтае прадпрыемства перапрацоўвала таксама скупленых свіней і быдла. Мясакамбінат „Рольмак плюс" у Нарве ўзнік у 2001 годзе на аснове мяснога прадпрыемства сельскагаспадарчага кааператыва. Кааператыў „Рольмак" захаваў фактычны кантроль над новым прадпрыемствам, пакідаючы сабе 85% паёў. Меў права да гэтага, бо надзяліў новую суполку зямлёй, будынкамі і некаторымі машынамі для перапрацоўкі мяса. Іншыя машыны здаў у арэнду. Апошнія ўзносы купілі работнікі і прыватныя асобы. Сярод іх быў старшыня Віктар Рэент.

— У 2001 годзе рашыліся мы на аддзяленне сельскагаспадарчай вытворчасці ад іншай прадукцыі. Тады адасобіліся мясакамбінат і нашы крамы, якія перанялі працоўныя суполкі. Крамы абавязаны былі прадаваць вызначаныя квоты нашых мясных вырабаў. Магазін у Нарве пераняў мясакамбінат. Нашай уласнасцю застаўся толькі адзін магазін каля рынку ў Гайнаўцы, — кажа Віктар Рэент. — Мясакамбінат патрабаваў дафінансавання, каб прыстасавацца да ўмоў дзейнасці ў Еўрасаюзе. Лічылі мы, што новая суполка з'яднае працаўнікоў і спрычыніцца да больш эфектыўнай работы.

Чаму абанкруціліся?

Да фінансавых складанасцей мясного прадпрыемства спрычынілася нізкая рэнтабельнасць мясных камбінатаў у 2001 і 2002 гадах і, магчыма, няправільная палітыка развіцця. Каб утры-

[працяг ☞ 3]

Дом сацыяльнай дапамогі ў Старыне ☞ 3

На адкрыццё Дома сацыяльнай дапамогі рашыўся тры гады таму Польскі камітэт сацыяльнай дапамогі. Улады Дубіцкай гміны перадалі будынак за сімвалічную залатоўку. Многа абсталявання дом сацыяльнай дапамогі атрымаў ад дабрачынцаў. У асяродку будуць працаваць лекар, дзве медсястры і абслуга.

Мова вучоных дурняў ☞ 4

Ужо год часу мінула, калі пачаў я купляць гектар бацькаўскай зямлі. Гмінная і павятовая адміністрацыя, натарыусы і суды забралі ўжо два разы больш грошай, чым тая зямля была вартая. Але калі я ў надзеі чакаў канчатковага судовага рашэння, атрымаў пісьмо з суда, зместу якога нават пры дапамозе тлумачальнага слоўнка не мог зразумець.

З Магілёва ў Беласток ☞ 8

Студэнты факультэта славянскай філалогіі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта правялі ў Беластоку восем працавітых дзён па запрашэнні філалагічнага факультэта Беластоцкага універсітэта. Адной з прычын прыезду была моўная стажыроўка, кожны дзень пачынаўся з заняткаў па польскай мове.

Я захапляюся беларусамі ☞ 9

Я з вялікай пашанай стаўлюся да беларусаў, якія пасля 1945 года перасяліліся на захад Польшчы і з Беласточчыны, і з-за Буга. Калі б не яны, большасці нашых прыходаў не было б. Гэта яны, беларусы, ішлі ва ўстановы і прабіваліся. І калі ў адным месцы давалі дазвол на заснаванне прыхода, дык давалі і ў другім.

Паўстагоддзя разам ☞ 10

Дзесяці парам ды іх родным яшчэ раз зайгралі Марш Мендэльсона ў нарваўскім загсе. Медалямі і граматамі за трывалае сужонства ўшанаваў іх прэзідэнт краіны Аляксандр Кваснеўскі. Не аднаму з сабраных закруцілася сляза ў вачах, а войту Нарваўскай гміны ламаўся голас, тым больш што і ён — юбіляр (паўстагоддзя ад дня нараджэння).

Бабры падгрызаюць дзяржаўны бюджэт ☞ 11

Бабры з'яўляюцца вельмі працавітымі звяркамі. Будуючы хаткі і запруды ссякаюць дрэвы, часта тоўстыя, што прыводзіць да залівання лясоў і сенажацей і ў выніку — да іх руйнавання.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Некаторыя наступствы „Вялікага Кастрычніка”

Чарговая, 86-я гадавіна кастрычніцкіх падзей у Санкт-Пецярбургу, тагачасным Петраградзе, як і ўсё мінулае стала ўжо набыткам гісторыі. Па-рознаму ўзгадалі яе ў краінах, дзе дзень 7 лістапада калісьці быў святам — дзесьці гэта кароткае паведамленне ў выпуску навін з невялікім расповедам аб сучасным стаўленні да камунізму, дзесьці — выхадны дзень з мудрагелістай назвай, маючы гістарычную сувязь з колішнім найвялікшым святам, а дзесьці — амаль як дзесяткі гадоў таму — Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Нягледзячы на агульнае адчужэнне ад камуністычных ідэалаў большасці дзяржаў былога „сацыялістычнага лагера”, яшчэ і сёння паўсюдна там можна сустрэць людзей, якія з пэўнай доляй настальгіі ўспамінаюць „камуну”. Гэта натуральна — чалавечая памяць мае выдатную асаблівасць забываць дрэннае і непрыемнае, тым больш, што жыццё працягваецца, а гэта само па сабе схіляе да высновы — усё што ні робіцца, да лепшага. Іншая справа, што дзе-нідзе неапраўданае пераўпрыгожванне мінулага і замоўчванне яго трагізму сталася нечым накшталт хваробы, якая не дазваляе аб’ектыўна падысці да асэнсавання перажытага народам значнага кавалка гісторыі. Менавіта такая сітуацыя ўзнікла сёння ў Беларусі.

Калі паглядзець звонку на святкаванне вышэйзгаданай даты, то яно сёлета, як, дарэчы, ужо некалькі гадоў запар праходзіць даволі сціпла. Найбольшае праяўленне „ўсенароднай” радасці ад бальшавіцкага перавароту цяпер можна пабачыць толькі на нешматлюдных і кароткачасовых мітынгах, што арганізуюцца мясцовымі ўладамі, ды і тое не паўсюдна. Так, у Мінску ціхае ўскладанне кветак членамі Партыі камуністаў беларускай (ПКБ) да помніка Леніну ды вывешаныя ўладамі чырвоныя сцягі і транспаранты толькі і нагадвалі аб „Вялікім Кастрычніку”. Большасць насельніцтва Беларусі ўспрымае гэтае свята за звычайны выхадны дзень, больш прыдатны да заканчэння сельгасработ на прысядзібных участках. Нават і прэзідэнт Лукашэнка, быццам бы мімаходзь павіншаваўшы суграмадзян са святам, укаціў у рабочую паездку па Гомельскай вобласці.

Але нягледзячы на тое, што Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі ўжо далёка не самае галоўнае дзяржаўнае свята, савецкая спадчына там падаецца практычна ў ружовых колерах і актыўна выкарыстоўваецца тая сляпая настальгія па камуністычных часах, што прысутнічае, дзе менш, дзе больш, ад Чукоткі да Балкан.

У той жа час варта адзначыць, што непасрэдна камуністамі беларускія ўладутрымаючыя сябе ўжо не называюць. Яны, як А. Лукашэнка, прынцыпова беспартыйныя, што, па іх меркаванню, мусіць сведчыць аб наўпроставай сувязі з беларускім насельніцтвам, якое насамрэч аказалася самым савецкім на тэрыторыі былога СССР.

Нягледзячы на нібыта „левізну” беларускага электарату, вышэйзгаданая Партыя камуністаў знаходзіцца ў апазіцыі да цяперашняга дзяржаўнага кіраўніцтва. Згодна тлумачэнняў кампартыйных лідэраў, трэба разумець, што сёння ў Беларусі ніякі не сацыялізм — краінай валадарыць вышэйшая бюракратыя, якая бескантрольна распараджаецца ўсім багаццем беларускага народа. Выкарыстанне ёю сацыялістычных лозунгаў не больш як падман, бо насамрэч гэтая дзяржаўная машына працуе на патрэбы аднаго чалавека — прэзідэнта. Таму сёння праграмай-мінімум для беларускіх камуністаў стала дэмакратызацыя грамадскага жыцця. З такога новакамуністычнага погляду на беларускую рэчаіснасць лагічным становіцца ўдзел ПКБ у разнастайных блоках і кааліцыях з тымі, хто напачатку 90-х гадоў забараняў КПСС, апячатваў абкамы і гаркамы, а сёння няўхільна прытрымліваецца „правых”, ліберальных перакананняў.

На жаль, большасць насельніцтва абыякава ставіцца да розных праграм, мэтаў і задач партый, у тым ліку і камуністычнай. Хоць трэба аддаць даніну павагі цяперашнім камуністам з ПКБ — яны ў вялікай ступені крытычна асэнсавалі савецкае мінулае як народа, так і сваёй партыі-папярэдніцы. Для іх камунізм ужо не „карыта, у якое бясконцым патокам цякуць невядома адкуль узятыя даброты, а ўвесь народ можа спакойна да гэтага карыта падыходзіць і хлябаць, колькі яму захочацца”. Адмаўляюць цяперашнія камуністы і ў магчымасці ўкаранення шчаслівай будучыні праз насілле супраць волі і жадання большасці народа. Сваёй задачай яны бачаць пераконванне народа ў тым, што сацыялістычнае грамадства адпавядае людскім інтарэсам.

Такое перасэнсаванне, зразумела, рэч неблагая. Праўда, дасягнуць ПКБ хаця б невялікай часткі сваіх мэтаў у цяперашніх палітычных умовах Беларусі, на мой погляд, не ўяўляецца магчымым, нягледзячы на „падагравану” лукашэнкаўскай уладай настальгію. І аб гэтым яскрава сведчыць стаўленне да галоўнага камуністычнага свята нібыта „левага” ў большасці беларускага электарату. Народжаная і загартаваная сямю дзесяцігоддзямі сацыялізму па Леніну і Сталіну грамадзянская абыякавасць прывяла да выключнай „савецкасці” беларусаў — некрытычным стаўленні да дзеянняў дзяржаўнага кіраўніцтва, страху адстойваць свае правы, разгляду ўласнага меркавання як чагосьці нікому непатрэбнага.

Ці здолеюць цяперашнія камуністы хоць бы разам з „правымі” змяніць савецкі светапогляд большасці беларускага насельніцтва? Дай Бог нашаму цяляці ваўка з’есці. Хаця ж... чаго ў свеце не бывае.

Уладзімір Лапцэвіч

Еўрапейскія варштаты

[1 ☞ працяг]

Тут у першую чаргу маглі б гэта скарыстаць выпускнікі школ, не толькі вышэйшых вучэльняў, якія вяртаюцца ў вёску і разбіраюцца ў тым, як запаўняць фармуляры патрэбныя на даплаты для сялян.

— На Падляшшы можна таксама выкарыстаць усходнюю мяжу як крыніцу прыбытку, — зазначыла міністр. — Гэты рэгіён ляжыць на стыку культур з прыцягальнымі каштоўнасцямі.

Не скрывала, аднак, што разам з уваходам у ЕС разрасцецца штаб чыноўнікаў працуючых у адміністрацыі, ды прытым гэта група павінна стацца больш прафесійнай, каб умела выкарыстоўваць наплываючыя еўрапейскія сродкі.

Падкрэсліла, што Польшчы патрэбна паскарэнне дынамікі гаспадарчага росту. Сёння, беручы пад увагу пакупную здольнасць грамадзян, сярэдні паляк дасягае ледзь 40 працэнтаў даходаў сярэдняга еўрапейца з „пятнаццаткі”. Незалежна ад таго, згодна з інфармацыямі пані міністр, Польшча бачыцца як найбольш прыцягальны партнёр для еўрапейскіх інвестараў і чацвёрты для інвестараў сусветных, м.інш. пасля Кітая і Расіі.

Ужо цяпер міністр па еўрапейскіх справах заклікала сялян, каб на працягу паўтара месяца да 15 чэрвеня будучага года запоўнілі фармуляры неабходныя для атрымання даплат. Калі тэрмінова з гэтым не справяцца, не дастануцца ім еўрасаюзныя грошы.

І завяршыла:

— Хочам увайсці ў ЕС развіваючыся дынамічна, з якім лічацца ў свеце, салідарны і аб’яднаны, які ўзнік, каб будаваць стабільнасць у Еўропе.

У час іншых выступленняў канферэнцыі „Еўрапейскія варштаты ў рэгіёнах” Ежы Ляшчынскі з Падляшскага аддзела Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі прыпомніў, што пасля ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі жывёлы, неабходных у выніку для атрымання еўрасаюзных грошай, неўзабаве чакае жыхароў вёскі абавязак г.зв. ідэнтыфікацыі зямельных участкаў. Пададзеныя разлікі будуць звярацца са спадарожнікавымі здымкамі. У рамках пілатажнай акцыі на Падляшшы, праведзенай у ваколіцах Махнатага і Снядова, паказалася, што 51% сялян правільна і дакладна задэкларавала колькасць грунтаў. Гэтыя даныя будуць неабходныя для карыстання грашыма ЕС.

У сваю чаргу Анджэй Грась, візавы эксперт з Установы камітэта еўрапейскай інтэграцыі прыпомніў, што ў рамках супольнай еўрасаюзнай візавай палітыкі паміж членскімі краінамі будзе весціся абмен інфармацыямі аб непажаданых асобах:

— Пры выдаванні віз г.зв. мяккі крытэрый гэта законны пункт, які гаворыць аб тым, што бярэцца пад увагу факт, ці згаданая асоба не пагражае бяспецы і парадку ў дзяржаве. Апіраецца яна на інтуіцыю консула ў час размоў дзеля атрымання візы.

Раней дадаў:

— Прыдалося б будаваць еўрапейскую супольнасць без віз, але візавая сістэма вынікае з патрэб супольнага ўнутранага рынку. Сам факт увядзення віз выклікае нейкія цяжкасці, асабліва ў індывідуальным руху, ды не стварае перашкод у функцыянаванні малых ці вялікіх прадпрыемстваў. У бізнесе справа ў абмене таварамі і паслугамі, а не людзьмі. Візы — праблема кантрабандыстаў.

Анджэй Грась зазначыў, што Польшча была гатова ў адносінах да Беларусі прыняць украінскі варыянт візавай асіметрыі. Аднак:

— Беларускі бок механічна стаяў на прынцыпе ўзаемнасці. Гэта сістэма некарысная для яе самой. Трэба даць Беларусі час для абдумання вынікаў такое развязкі. Польскі бок не націскае. Аднак, не разлічваю на ніякія змены, і гэта па палітычных прычынах. Калі б яны наступілі, трэба было б прызнаць памылку.

Прытым дадаў, што незалежна ад увядзення сёлета візавай сістэмы, у параўнанні з 2002 годам экспарт з Беларусі ў Польшчу пабольшыўся на 60%, а з Польшчы ў Беларусь — на 50%.

— Усё больш польскія прадпрымальнікі ўсведамляюць сабе выгаду ад прысутнасці ў Беларусі і факту, што ў яе мытны саюз з Расіяй, значыць, што прысутныя яны і на расійскім рынку.

Мацей Халадоўскі

Ларысе Геніюш паставілі помнік у Зэльве

У Зэльве ўсталяваны першы помнік геніальнай беларускай паэтцы Ларысе Геніюш. Ён месціцца на дзядзінцы побач з праваслаўнай царквой. Дазвол на яго ўсталяванне даў мітрапаліт Філарэт.

Помнік, які ўяўляе сабой камень каля двух метраў вышынёй з бюстам паэткі, выканаў скульптар Міхась Інькоў, які сам паходзіць з Зэльвы, яшчэ ў 1991 годзе. З таго часу ўлады дазволу на яго ўсталяванне так і не давалі. Дарэчы, устанаўлівалі помнік вагою ў адну тону ўручную, паколькі не ўдалося дамовіцца наконт крана. Дагэтуль невядома, калі адбудзецца яго ўрачыстае адкрыццё. З прадстаўнікоў мясцовай улады падчас усталявання помніка так ніхто і не з’явіўся.

Па словах Станіслава Судніка, які прымаў удзел ва ўстаноўцы помніка, справу яшчэ не давялі да канца, на камені мяркуюць выбіць імёны ахвярадаўцаў, побач — умацаваць металічныя кветніцы, добраўпарадкаваць пляцоўку.

Нагадаю, што Ларыса Геніюш пасялілася ў Зэльве ў 1956 годзе, пасля вызвалення з ГУЛАГу. Яна адмовілася прыняць савецкае грамадзянства. Памёрла ў Зэльве 20 гадоў таму, застаючыся грамадзянкай Чэхаславакіі, дзе яе разам з мужам арыштавалі ў 1948 годзе і вывезлі ў СССР. Ларыса Геніюш дагэтуль не рэабілітаваная ўладамі Беларусі.

Але дагэтуль у Беларусі больш не нараджалася такіх паэтак, як яна.

Міхаіл Карневіч
„Биржа информации”,
№ 301 ад 13.11.2003 г.

Занатоўкі з маёй рэзервацыі

Беласточчына — краіна шчаслівай старасці

Нарадзіўся я ў вёсцы Доўгі Брод, непадалёк Дома сацыяльнай дапамогі ў Старыне, што ў гміне Дубічы-Царкоўныя, які ўрачыста адкрылі ў пачатку лістапада 2003 г. Зараз пражываю ў Беластоку, але як пушчанскі абарыген з цікавасцю гляджу на гэтую важную інвестыцыю на маёй роднай Гайнаўшчыне. Не залічваю ў лік інвестыцый новапабудаванай пагранічнай заставы ў маёй гміне, бо мне, як гісторыку, даўно вядома: дзе службы — там і клопаты. Адкрыццё Дома сацыяльнай дапамогі ў Старыне гэта для нас — мясцовых, тутэйшых — сапраўдны гонар. Дзякуем, што не забылі пра лячэбны водар мясцовых, жывічных соснаў славутай Белавежскай пушчы, дзякуючы якому зможам дажыць шчасліва глыбокай старасці. І пабачыць, як абязлюдзілася і пабяднела наша Бацькаўшчына. Як сёння дзеля хлеба, дзеля Еўропы — для выжывання мігрыруюць беларусы Беласточчыны, бо не маюць сродкаў, каб адчуваць сябе гаспадарамі на сваёй зямлі. Шчаслівыя нашы сэрцы і душы, калі штодзень прыходзіцца аглядаць выкуп бацькоўскіх хат і гаспадарак варшаўска-беластоцкім чынавенствам і партыйным апаратам. Адчуваем незабыўную радасць ад продажу свайго, бо ў кішэнях і на банкаўскіх рахунках жыхароў памежнай сцяны пуста. Наш лёс штораз больш падобны на лёс індзейцаў Паўднёвай Амерыкі. Без пачуцця быць гаспадарамі зямлі, без інвестыцый становімся толькі і выключна аб'ектам даследаванняў хмары псеўданавукоўцаў і журналістаў, якія амаль бясплатна маюць такую экзотыку на мяжы Еўрасаюза. І цікавая наша радасная старасць для фатографаў і царквы. Адны і другія цэняцца вельмі дорага за права да нашага адыходу ў вечнасць. Лацінаамерыканская літаратура ў беларуска-беластоцкай рэчаіснасці. Хто яе адважна апіша, гарантаваная Нобелеўская прэмія.

Czujcie się w nim, jak we własnym domu

Прыемна моцна занятай палітычна-адміністрацыйнай эліце правесці ў нас свабодны час; у драўляных дамах, пушчанскіх леснічоўках, на паляваннях, каштуючы кумпяк і напіханую пальцам каўбасу. Калі ёсць яда, будзе і культура. За чарку і скварку спяваць і танцаваць будзем перад вамі, як прэзідэнт Кваснеўскі перад спецкамісіяй. Бо вы такія спагадлівыя — любіце „рускія" песні.

Мы мясцовыя — бяздарныя; нат працы не зможам знайсці. Адзіны выхад — запісацца ў партыйнае, сямейнае жыццё і можа павязе. А так у сапраўднасці наш рэальны шлях — гэта дамы сацыяльнай дапамогі і там вызначаецца нам месца. Віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч на адкрыцці Дома ў Старыне гаварыў (прыводжу за „Кур'ерам паранным"): „W Starzynie znajdzie swój dom kilkadziesiąt osób i zamieszka w standardzie prawdziwie europejskim. Czujcie się w nim, jak we własnym domu". Дзякуй за ласку. Што ж за ўмовы, але я хацеў бы бачыць такі стандарт даступным у кожным доме ўсходняй сцяны. А каналізацыйная сістэма надалей мара нашых гмін. Водаправоды і тэлефоны з'явіліся ў нас толькі на пераломе XX і XXI стагоддзяў. Міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, адзін з ініцыятараў пабудовы, прамовіў такім чынам: „Ten dom jest wspaniałym pomysłem na to, co robić w biednych gminach, gdzie pozostają puste budynki po szkołach" (прыводжу за „Кур'ерам паранным"). А мне наіўнаму лакальнаму патрыёту здавалася, што ў бедных гмінах трэба інвеставаць, каб не з'язджалі людзі, а школы павінны быць надалей школамі. Аніякія дамы сацыяльнай дапамогі не заменяць годнага жыцця ў сваёй уласнай хаце. Тады на апошняе развітанне пад вясковымі крыжамі прыйдуць суседзі і паспеюць даехаць дзеці, бо яны побач нас. І знойдуць час на апеку над намі. Бо на шчасце не мусілі ад'ехаць за хлебам у Амерыку, але могуць развіваць нашу Малую Айчыну.

Школа ў Старыне будавалася ў шасцідзесятых гадах у рамках агульнапольскай акцыі „Тысяча школ на тысячагоддзе Польшчы". Зараз лепей сказаць „Дамы сацыяльнай дапамогі ў кожнай усходняй гміне". І пад такім лозунгам таксама можна змагацца на выбарах, бо ў гаспадарчы цуд ніхто ўжо не паверыць. А ў газетах, не дай Божа, але поўна будзе аб'яў кшталту „Za miejsce i opiekę w Domu Pomocy Społecznej oddam w rozliczeniu dom i gospodarstwo w powiecie... (siemiatyckim, hajnowskim, bielskim, białostockim, sokólskim)".

Яўген Вапа

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Адрамантаваны будынак асяродка ў Старыне

Дом сацыяльнай дапамогі ў Старыне

Са студзеня 2004 года пачне працаваць Дом сацыяльнай дапамогі ў Старыне, на які прыстасаваны быў школьны будынак. Яго адкрыццё адбылося 8 лістапада з удзелам намесніка прэм'ер-міністра Марка Поля, міністра замежных спраў Владзімежа Цімашэвіча і падляшскага віцэ-ваяводы Ежы Паўяновіча. На мерапрыемства сышліся пажылыя жанчыны са Старыны і суседніх пасёлкаў.

— Хочам, каб дом наведвалі жыхары навакольных вёсак. Будуць яны маглі паразмаўляць між сабою. Апякункі асяродка будуць дапамагаць хворым і адзінокім са Старыны, — заявіла Ева Курулішвілі, генеральны сакратар Польскага камітэта сацыяльнай дапамогі.

Падставовая школа працавала яшчэ ў сямідзесятыя гады. У 1984 годзе па дэмаграфічных прычынах школа была закрыта. Пасля ў будынку знаходзіўся асяродак адпачынку. Арганізаваліся там Сустрэчы „Зоркі" і адпачывала школьная моладзь. На адкрыццё Дома сацыяльнай дапамогі рашыўся тры гады таму Польскі камітэт сацыяльнай дапамогі, якім кіраваў Владзімеж Цімашэвіч. Улады Дубіцкай гміны перадалі будынак за сімвалічную залатоўку. Узамен улады мадэрнізавалі дарогу з Войнаўкі ў Старыну. Многа абсталявання дом сацыяльнай дапамогі атрымаў ад дабрачынцаў. У асяродку будуць працаваць лекар, дзве медсястры і абслуга. Будуць арганізавацца заняткі па народным рукадзеллі, разьбе, а летам — у агародчыку.

— У гміне вялікае беспрацоўе і будзем прымаць на працу асобы з навакольля. Асяродак створаны згодна еўрапейскім стандартам. Знаходзіцца ў ім сем пакояў, а каля кожнага — ванная і туалет, — сказаў дырэктар асяродка Казімеж Пулторак.

Жыхары будуць маглі карыстацца рэабілітацыйным залам і пакоямі дзённага адпачынку. Са студзеня ў асяродку зможа пасяліцца 40 асоб, а пасля плануецца пабольшаць колькасць месцаў да васьмідзесяці. Ахвотных стаць жыхарамі Дома сацыяльнай дапамогі ў Старыне накіроўваць будуць гмінныя асяродкі сацыяльнай дапамогі.

Аляксей Мароз

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Марэк Поль (злева) і Ежы Паўяновіч

Неплацежаздольны „Рольмак плюс"

[1 ☞ працяг]

мацца на рынку, трэба было інвеставаць у машыны, прыстасоўваючы прадукцыю да рыначных патрабаванняў. У прадпрыемстве „Рольмак плюс" мала было сродкаў на інвестыцыі і не знайшоўся інвестар, які даў бы грошы на мадэрнізацыю. Задоўжанасць камбіната ад 2001 і 2002 гадоў ускладніла работу ў 2003 годзе. Суполка перастала плаціць пастаўшчыкам свіней і быдла, у тым ліку Сельскагаспадарчаму вытворчаму кааператыву „Рольмак". Пасля сяляне стрымалі пастаўку сыравіны і абвострылі патрабаванні вяртання грошай за папярэднія пастаўкі жыўнасці. Некаторыя рашыліся падаць справу ў суд. Каля мяснога камбіната пачалі збірацца сяляне з патрабаваннем вярнуць даўгі. Калі суполка апынулася без сыравіны і даўгі перавысілі вартасць прадпрыемства, банкі не захацелі даваць новыя крэдыты. Управа мясакамбіната рашылася паставіць суполку ў стан неплацежаздольнасці.

— Выдатна пагоршыўся фінансавы вынік прадпрыемства пры папярэдняй управе. Яе старшынёй быў чалавек, які хацеў інвеставаць у прадпрыемства. Аднак пасля некалькіх месяцаў адмовіўся ад інвестыцый і пакінуў старшынства, — кажа сённяшні старшыня ўправы мясакамбіната „Рольмак плюс" Марк Павільч. — Яшчэ ў жніўні накіраваную ў суд заяву аб эканамічнай няздольнасці адобрыў наш галоўны пастаўшчык сыравіны кааператыў „Рольмак". Прадбачваў ён растэрміноўку даўгоў так, каб найменш трацілі малыя пастаўшчыкі, значыць, сяляне. З першага кастрычніка ўступіла ў сілу пастанова аб пагадненнях і мы вымушаны былі нанова ствараць праект пагаднення і прадставіць яго суду. Трэба было распрацоўваць каштоўныя аналізы перспектыў развіцця прадпрыемства і мы не рашыліся на падрыхтоўку чарговага пагаднення. Быў шанц выправіць становішча прадпрыемства, але артыкулы ў прэсе выклікалі паніку сярод нашых пастаўшчыкоў і таму наша ўправа ў другой палове кастрычніка рашылася выступіць у гаспадарчы суд з заявай аб эканамічнай няздольнасці. Перад гэтым рашэннем палепшылася якасць нашых прадуктаў і вырасла продаж мясных вырабаў. Хаця прадавалі мы ў два разы менш, чым раней, паменшала колькасць зваротаў нашых прадуктаў з магазінаў. Зараз усе абавязацельствы прадпрыемства складаюць суму больш чым 1 мільён злотых. Найбольш стратны на нашым банкруцтве кааператыў „Рольмак". Завінавачанасць для яго перавышае суму 200 тысяч злотых. Страціў ён таксама капітал і маёмасць, перададзеныя нашаму прадпрыемству. Ліквідатар, які будзе выплачваць нашыя абавязацельствы, у першую чаргу заплаціць працаўнікам, установам і індывідуальным пастаўшчыкам.

У суполцы „Рольмак плюс" працавала пад 50 чалавек (апошнім часам каля сарака). Зараз звольнены амаль увесь калектыў. Вялікая бяда кранула некаторыя сем'і, дзе па двое бацькоў, што працавалі на мясакамбінаце, апынуліся без працы. Забяспечаны машыны і вытворчыя цэхі. Некалькі сторажаў даглядаюць за маёмасцю, старшыня Марк Павільч са сваім памочнікам чакаюць рашэння суда і прыезду ліквідатара. Будынкі і машыны можа купіць любы мясны камбінат і адкрыць тут свой філіял або хаця апрацоўваць купленую жыўнасць.

Аляксей Мароз

Вачыма паляка

Дух рэвалюцыі

Незаўважна мінула чарговая гадавіна выбуху Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пасля 1989 г. друк, радыё і тэлебачанне ішлі навыперадкі ў ідэях на трактаванне яе гумарыстычна. Мабыць, таму, што ў гэтым годзе не трапілася круглая гадавіна, рэвалюцыйныя жарты не кінуліся мне ў вока (вуха). Затое ў хатніх шуфлядах з рознага тыпу дакументамі трапіў я на каталог з выставы, арганізаванай у 1977 г. з нагоды рэвалюцыі ў беластоцкім Музеі рэвалюцыйнага руху (маладзейшых інфармую, што сёння гэта Гістарычны музей). Расказвала яна аб удзеле жыхароў Беласточчыны ў гэтай падзеі, сімвале, які, ці гэта каму падабаецца ці не, змяніў лёсы свету. Перакідваючы гэты каталог прыпомніў я сабе сямейныя аповеды аб Рамуальдзе Муклевічы, блізкім сваяку маёй бабулі з боку маці. Памятаю з дзяцінства, як адна маладая стажорка радыёжурналістыкі, сёння вядомая і з рознымі званнямі універсітэцкая выкладчыца, прабавала штосьці аб Муклевічы выцягнуць ад мае бабулі. Да яе візіту бабуля старанна падрыхтавалася. Апранула нават уласнаручна пашытую, снежна-белую, карункавую святочную блузку, так, быццам маглі яе ўбачыць радыёслухачы. Стажорка прыйшла, пачала ставіць пытанні. Бабулі, аднак, адняло голас. Не магла выціснуць з сябе ў мікрафон ні слова. Толькі пасля таго, як пакінула хату свежаспечаная журналістка, бабуля разгаварылася. Сёння з яе ўспамінаў памятаю толькі тое, што бабуля не магла зразумець, чаму Рамуальда Муклевіча Сталін загадаў у 1938 годзе расстраляць. Аб гэтым, дарэчы, даведалася ўжо пасля апошняй вайны. Фактычна, цяжка зразумець існасць хвалі сталінскіх чыстак з таго і іншых перыядаў. Бабуля, мабыць, перад радыёмікрафонам нават у той час, значыць, у канцы сямідзесятых, не змагла паставіць такое пытанне. Памятала Рамуальда Муклевіча з далятаючых з розных бакоў аповедаў, як удзельніка штурму на Зімні палац, намесніка камандзіра ваеннай авіяцыі СССР і ўрэшце ў 1926-1933 гадах камандзіра савецкага ваеннага флоту, ці, пасля, намесніка народнага камісара ваеннай прамысловасці. Не сказала мне, аднак, як гэты, народжаны ў Супраслі, тэкстыльшчык з Беластока і Лодзі, трапіў каля 1914 г. у Расію (здаецца, у Петраград). Мабыць, ужо не даведаюся, бо няма ўжо ў маёй сям'і нікога, хто мог бы мне пра гэта сказаць.

Маўчаць таксама сем'і іншых удзельнікаў рэвалюцыі, якія паходзілі з Беласточчыны. Цяжка гэтаму здзіўляцца. Колішніх герояў прадстаўляюць сёння як ворагаў і здраднікаў. Нікому ўжо не хочацца нават адказваць на пытанні, як яны ўмяшаліся ў Рэвалюцыю, што імі кіравала, якія гэта былі людзі. А шмат з іх адыгрывала значную ролю ў гэтай падзеі, мабыць, не рашаючую, але сімвалічную. Як успомненыя ў музейным каталогу Якуб Мартынюк з Новага Беразова ці Эдвард Шэўка са Старасельцаў, якія знаходзіліся на крейсеры „Аўрора" ў час, калі меў ён даць знак-залп рэвалюцыянерам. Праўда, калі я быў у Расіі ў канцы ўлады Гарбачова, той факт паставілі пад сумненне, ды, так ці іначай, абодва салдаты служылі на „Аўроры". Так як і ў патушэнні, як гэта калісьці акрэслівалася, антысавецкага загавору Керанскага і Краснова прымаў удзел Аляксандр Пэршка з Гайнаўкі. Прозвішчаў пералічыць можна шмат. Налічыў я больш за дзве сотні беластачан. Ці аб іх удзеле, незалежна, як яго ацаняем, трэба забыць або глядзець выключна праз прызму ацэнак вялікай гісторыі? Сумняваюся.

Сёння, даслоўна, няма часу на такія дыскусіі. Амаль дзень да гадавіны выбуху Кастрычніка 1917 г. левы польскі ўрад вуснамі віцэ-прэм'ера Ежы Гаўзнера прадказаў сур'ёзныя скарачэнні ў бюджэце будучага года. Як усё паказвае, датычыць яны будуць таксама найслабейшай часткі грамадства: пенсіянераў. Урад прабуе, аднак, даць народу пачуццё нейкай справядлівасці. У сябе таксама будзе скарачаць. Апавяшчае ашчаднасці ва ўрадавай адміністрацыі ў цэнтры і ў глыбінцы — у ваяводскіх управах. Хоча абмежаваць лік міністэрскіх дарадчыкаў і іншых чыноўнікаў, закупку аўтамашын, а нават не выключае ліквідацыі Сената. У сапраўднасці гэтых скарачэнняў, аднак, не адчуюць кішэні грамадзян. Для прыкладу, маршалак Сената Лёнгін Пастусяк прыпомніў, што ўтрыманне Вышэйшай палаты парламента каштуе кожны месяц кожнага падаткаплацельшчыка каля 25 грошаў. Мусіць, аднак, пры прапагандысцкай ігры віцэ-прэм'ера Гаўзнера злаваць, напрыклад, факт, што будучы бюджэт падляшскага ваяводы будзе пабольшаны на каля 14 мільёнаў. А за тыя грошы будуць куплены восем аўтамашын, паменяны вокны ў ваяводскай установе і разбудавана канферэнц-зала.

— Гэта ашчаднасці. Мусім клапаціцца за маёмасць. Іначай усё зруйнуецца, — тлумачыў у Радыё Беласток Анджэй Танаеўскі, генеральны дырэктар ПВУ.

Гэтыя выказванні, а перш за ўсё дзеянні ўзмацняюць пачуццё несправядлівасці, недавер да ўлады, боязь за будучыню, з і так цяжкім сёння. Такія настроі — падставы рэвалюцыі, таксама Кастрычніцкай. Але нашто аб гэтым памятаць? Азваўся ўва мне рэвалюцыйны дух. Урэшце ж, і ў маіх венах плыве таксама кроў Рамуальда Муклевіча.

Мацей Халадоўскі

Мова вучоных дурняў

Апошнім часам уся краіна жыве праблемай правільнага запаўнення фармуляраў, на аснове якіх польскія сяляне змогуць атрымаць еўрасаюзныя грошы. Курсы па адукацыі сялянства пачалі праводзіць нават некаторыя каталіцкія епіскапы. Аказваецца, прыбытковасць гаспадаркі будзе цяпер залежаць не ад вынікаў працы ў полі, але ад правільнасці запісаў у рубрыках. Некалькі тысяч новых чыноўнікаў стане вырашаць каму даваць, а каму не даваць еўрасаюзныя датацыі.

З моманту вялікай адміністрацыйнай рэформы Польшчы прайшло некалькі гадоў. Узніклі паветы і самаўрадавыя ваяводствы. Засталася таксама, як раней, ваяводская дзяржаўная адміністрацыя. На працягу апошніх шасці гадоў адміністрацыя памножылася ў два разы. Мэтай рэформы мела быць скарачэнне ліку чыноўнікаў, а выйшла — як заўсёды. Цяпер, каб утрымаць гэты апарат, трэба ашчаджаць на ахове здароўя, адукацыі, культуры і пенсіянерах.

Найгоршае аднак у гэтым шаленстве размнажэння дзяржаўных структур тое, што яны зусім не працуюць у карысць грамадзян і дзяржавы, а толькі дзеля апраўдання свайго існавання. Спроба аформіць якую-небудзь справу заўсёды пачынаецца з запаўнення шматлікіх фармуляраў, да якіх абавязкова трэба прыкласці каштоўную марку, сама менш за 10 злотых. Пасля трэба пачакаць пакуль начальнікі не прымуць адпаведныя рашэнні. Працягваецца тое чаканне тыднямі. У канцы атрымліваем інфармацыю, што трэба нам прынесці яшчэ нейкія пасведчанні ад іншых бюракратаў. Зноў фармуляры, маркі, чаканне...

Ужо прайшоў год, калі „пачаў я купляць" гектар бацькоўскай зямлі, якая ад дваццаці гадоў знаходзілася ва ўладанні Заблудаўскай гміны і ляжала сабе аблогам. Гмінная і павятовая адміністрацыя, натарыусы і суды ўзялі ўжо два разы больш грошай, чым тая зямля вартая. Але калі я ў надзеі чакаў канчатковага судовага рашэння, атрымаў паведамленне з суда, зместу якога нават пры дапамозе *Вялікага тлумачальнага слоўніка польскай мовы* не мог зразумець. Судовы рэферандар піша так: „Sąd Rejonowy Wydział Ksiąg Wieczystych wzywa do złożenia zwrotnego poświadczenia odbioru wysłanego do Agencji Nieruchomości Rolnych zawiadomienia o treści aktu notarialnego, ewentualnie pisemnej informacji Agencji, odnośnie zawiadomienia jej treści w/w aktu notarialnego w terminie 14 dni pod rygorem oddalenia wniosku". Вядома толькі, што чыноўнік нечага патрабуе. Можна таксама меркаваць, што ён з'яўляецца ўласнікам дыплома юрыдычнага факультэта. Пэўна выйшла нейкае распараджэнне нейкага важнага міністра, напісанае паўпісьменным чыноўнікам ягонай канцылярыі. Вучонаму дурню судовай адміністрацыі стала яно інструментам тэрору ў адносінах да грамадзян. Каб спыніць гэты бюракратычны кашмар, чалавек найчасцей вымушаны купляць паслугі ў іншага юрыста, які за адпаведную суму зможа расшыфраваць бюракратычную балбатню.

Афармленне нават нязначнай справы патрабуе часу, грошай і сталёвых нерваў. Атрымаўшы такое пісьмо, чалавек ставіць сабе пытанне: чаму, разумеючы ўсе словы, не разумею сутнасці напісанага? Хто тут непісьменны? Чаму трэба пасылаць нешта ў нейкую „агенцыю", да якой чалавек не мае ніякага дачынення? Чаму грамадзянін вымушаны афармляць карэспандэнцыю, якую раней вялі паміж сабой установы за грошы падаткаплацельшчыкаў? Цяпер плацім нават большыя падаткі, але нічога з гэтага не вынікае, толькі расце армія тэрарыстаў з пячаткамі дзяржаўных устаноў.

У цывілізаваным свеце адміністрацыя прызначана служыць грамадзянам, а ў нас можа скласціся ўражанне, што грамадзянін існуе дзеля таго, каб тупы чыноўнік змог даказаць „kto tu rządzi". Калісьці мяне вучылі, што два і два гэта чатыры. Аднак, калі на кантроль у „Ніву" прыйшоў камсамолец з НІК, пачаў пераконваць, што паводле законаў два і два можа быць нават шэсць з паловай. Колькі ў сапраўднасці два і два, яго не цікавіць, важна тое, што ў гэтай справе сцвярджаюць законы. А яны вырашаюць, аказваецца, пра ўсё — у выглядзе сотняў распараджэнняў, кодэксаў, спецзаконаў. Чалавек, які выходзіць з хаты, павінен ведаць, што ягоны кожны крок ацэньваецца ў кантэксце згоднасці з законамі. Прабаваў я нават прачытаць тыя найбольш неабходныя ў штодзённым жыцці, але іхняя мова нагадвае слэнг крымінальнікаў — зразумелы выключна ў гэтым асяроддзі.

Яўген Мірановіч

Звалка і кляшчы

30 кастрычніка 2003 года радныя Гайнаўскага павета абмяркоўвалі план агульнапавятовай звалкі адкідаў і смецця. Улады Нарваўскай і Кляшчэлеўскай гмін згодны, каб звалка смецця будавалася на іх тэрыторыі. Аднак аддаленая ад Гайнаўкі звалка павысіць кошты давозу смецця. Таму трэба звалку будаваць у Гайнаўцы або яе наваколлі. Для будовы агульнапавятовай звалкі смецця патрэбна згода большасці гмін. Аднак гміны атрымалі сродкі Павятовага фонду аховы асяроддзя на селектыўны збор адкідаў.

— Няма пастаноў, якія на староства накладалі б абавязак парадкавання адкідаў. Гэта задача гмін, але мы хацелі б вырашыць справу ў рамках Еўрарэгіёна „Белавежская пушча", — сказаў стараста Уладзімір Пятрочук. — Добра было б, каб спальваць адкіды з суседніх Сямятыцкага і Бельскага паветаў, дзе ў трох нашых паветах жыве 150 тысяч асоб, бо тады кошты звалкі былі б меншыя.

Зараз супольнай звалкай зацікаўлены ўлады горада Гайнаўкі, Гайнаўскай і Белавежскай гмін. У Нарваўскай і Нараўчанскай гмінах пабудаваны асобныя звалкі.

У час сесіі была прадстаўлена інфармацыя пра санітарна-гігіенічныя ўмовы ва ўстановах і прадпрыемствах Гайнаўскага павета. Паколькі вялікую тэрыторыю павета займае Белавежская пушча, на Гайнаўшчыне адзначаны шматлікія выпадкі хвароб выкліканых кляшчамі. У 1998-2002 гадах зарэгістраваны 82 асобы, якія захварэлі на кляшчовы менінгіт і 398 чалавек хворых на барэльёз. Хаця ў 2002 г. лік кляшчовых хвароб паменшаў, то надалей адстрашваюць яны турыстаў ад Белавежскай пушчы.

Радныя звярнулі ўвагу на вялікую колькасць людзей з каростай. У Гайнаўцы лекары знайшлі каросты ў 48 асоб, а ў павеце — у 28 чалавек. У гэтым паказчыку Гайнаўскі павет апярэдзіў усе паветы Падляшскага ваяводства.

Радныя перасцерагалі, што Павятовая санітарна-эпідэміялагічная станцыя можа пазакрываць вясковыя асяродкі здароўя на Гайнаўшчыне з-за недастасавання іх да еўрасаюзных патрабаванняў. Галоўнай праблемай можа стаць неабходнасць раздзялення вясковых асяродкаў здароўя на дзве часткі: для дарослых асоб і дзяцей. Пасля праведзеных Павятовай санэпідэмстанцыяй у Гайнаўцы ў 2002 кантролю аказалася, што згодна з санітарнымі патрабаваннямі працуюць толькі непублічныя амбулаторыі „Гаймед" у Гайнаўцы, „Унімед" у Кляшчэлях і асяродак здароўя ў Кленіках. Ва ўсіх апошніх выяўлены былі няправільнасці.

Аляксей Мароз

Новыя камандзіровачныя

Затраты на Раду павета ў Бельску-Падляшскім у 2002 годзе склалі амаль 200 тысяч злотаў. З верасня г.г. кошты аплаты радных — дзякуючы прынятай пастанове аб велічыні камандзіровачных — павінны аблягчыць павятовы бюджэт.

Радныя прынялі пастанову аб абагульненых месячных камандзіровачных без увагі на лік праводзімых у той час пасяджэнняў камісій, сесій Рады і Управы павета. Гэтая велічыня была ўстаноўлена на ўзроўні сярэдніх гадавых камандзіровачных. У ранейшай сістэме за кожнае пасяджэнне радныя атрымлівалі па 216 злотаў; цяпер радны атрымае абагульненую месячную камандзіровачную ў памеры 600 злотаў, старшыня пастаяннай камісіі Рады павета — 750 зл., намеснік старшыні Рады — 870 зл., а старшыня Рады і няштатны член Управы — 1 450 зл. Уведзена таксама адлічэнне за няўзгодненую са старшынёй Рады, камісіі ці ўправы адсутнасць у пасяджэннях: 30% раднаму і 15% няштатнаму члену ўправы і старшыні Рады павета.

Міхал Мінцэвіч

Даведка аб навучанні беларускай мовы ў школах Падляшскага ваяводства

мясцовасць	*агульны лік навучэнцаў*	*вывучаюць бел. мову*	*настаўнікі бел. мовы*
пачатковыя школы			
Аўгустова	153	64	І. Лукашук І. Хадакоўская
Бельск-Падляшскі ПШ 3	583	579	М. Маркевіч А. Мароз В. Міхноўская
Храбалы	78	32	І. Данілюк
Орля	173	97	І. Нівінская Я. Тхужэўская М. Варабей
Чаромха	272	13	Г. Саўчынская
Чыжы	90	89	А. Лаеўская В. Андрасюк
Кленікі	37	36	В. Флярчук
Дубічы-Царкоўныя	92	80	М. Казімярук
Гарадок	305	72	Т. Бялькевіч
Гайнаўка ПШ 1	69	11	А. Масальская
Гайнаўка ПШ 2	488	63	А. Якімюк З. Кердалевіч
Гайнаўка ПШ 3	109	53	М. Крук
Гайнаўка ПШ 6	474	142	Л. Грыгарук
Дубіны	119	65	Н. Куптэль
Новы Корнін	74	37	Э. Сухадола
Арэшкава	46	30	І. Герасімюк
Кляшчэлі	178	41	І. Тамашук С. Трашчотка
Нарва	224	92	Н. Абрамюк
Ласінка	15	10	М. Базылюк
Нараўка	270	69	А. Кандрацюк Л. Тарасевіч
Старое Ляўкова	15	9	К. Паскробка Г. Рэент
Семяноўка	7	5	Л. Тарасевіч
Рыбалы	38	38	І. Мордань Э. Клімюк
Залукі	45	20	Я. Грушэўская
Беласток ПШ 4	472	46	А. Ваўранюк
Разам: 4 426		**1 793 (40%)**	
гімназіі			
Гарадок	240	23	Т. Бялькевіч
Бельск-Падляшскі Гімназія 3	337	337	В. Бабулевіч Т. Русачык Я. Падолец
Орля	73	39	І. Нівінская Я. Тхужэўская
Аўгустова	202	46	І. Лукашук
Гайнаўка Гімназія 1	472	4	А. Новік
Гайнаўка Гімназія 2	291	89	Л. Грыгарук
Гайнаўка Гімназія 3	79	3	А. Якімюк З. Кердалевіч
Гайнаўка Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы	177	177	В. Сянкевіч І. Грыгарук Я. Карчэўскі
Чыжы	65	50	А. Лаеўская В. Флярчук
Дубічы-Царкоўныя	63	55	М. Казімярук Г. Трашчотка
Дубіны	134	42	В. Касцевіч Н. Куптэль
Кляшчэлі	102	25	С. Трашчотка
Нарва	148	44	Н. Абрамюк
Нараўка	193	63	А. Кандрацюк
Беласток Гімназія 7	564	11	А. Ваўранюк
Разам: 3 061		**1 009 (33%)**	
ліцэі			
Бельск-Падляшскі II Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання	472	472	А. Бжазоўская Я. Таранта А. Нідэ
Гайнаўка II Агульнаадукацыйны ліцэй з дадатковым навучаннем беларускай мовы	359	359	В. Сянкевіч І. Грыгарук Я. Карчэўскі
Разам: 831		**831**	
Агульны лік навучэнцаў у 2003/2004 навучальным годзе: **3 633**			

Статыстыка паводле інфармацыі дырэктараў школ, перададзенай каардынатару навучання моў нацыянальных меншасцей Куратoрыі асветы ў Беластоку. (гак)

Вопыт настаўніцы беларускай мовы

У другім паўгоддзі 2002/2003 навучальнага года галоўным метадам навучання беларускай мовы ў III кл. гімназіі я выбрала адзін з актыўных спосабаў навучання — метад адукацыйнага праекта.

Яго сутнасць заключаецца ў тым, што група вучняў рэалізуе акрэсленае мерапрыемства вялікага маштабу паводле раней прынятых меркаванняў.

Вучні раней павінны ведаць:

— якая тэма іх працы;

— які тэрмін рэалізацыі прынятага задання;

— якія асобы будуць адказныя за пасобныя этапы працы;

— якая і за што чакае іх ацэнка;

— што могуць працаваць у групах або індывідуальна;

— рэзультат іх працы будзе паказаны акрэсленай публіцы.

Думаю, што метад праекта магла я выбраць таму, што:

— на ўрокі беларускай мовы прыходзілі толькі ахвотныя вучні;

— урокі вяліся адзін раз у тыдні (тры гадзіны пасля абеду);

— мае вучні былі беларускай нацыянальнасці, таму я хацела, каб яны самі адкрылі багацце і прыгажосць іх духовай спадчыны.

Працу над праектам мы пачалі ад вывучэння ведаў пра беларускія народныя абрады. Я ведала, што ў вёсках маіх вучняў можна даведацца „про колісьне". Мясцовы фальклор мне добра вядомы таму, што ён быў тэмай маёй магістэрскай дысертацыі.

Веды пра абрады мае навучэнцы чэрпалі таксама з літаратуры. На ўроках мы гаварылі пра вясельныя, хрэсьбінныя, жніўныя і веснавыя абрады. Маіх вучняў найбольш зацікавілі вераванні звязаныя з цяжарнасцю жанчыны, нараджэннем дзіцяці і хрэсьбінамі.

Беручыся за працу над рэалізацыяй праекта я ўлічыла патрабаванні маіх вучняў, іх магчымасці і зацікаўленні. Я ведала, што гэта вучні сур'ёзныя, адказныя, праяўляюць ініцыятыву, заўсёды ахвотныя да працы. Я ведала таксама асяроддзе вучняў. Гэта ж сярод старэйшых жыхароў вучні мелі правесці апытанні.

Раней я даведалася, што ў бібліятэцы Беларускага музея ў Гайнаўцы даволі многа літаратуры аб беларускай абраднасці. Кніжкі я пазычыла на ўрокі.

Вучні працавалі ў групах або індывідуальна. Яны запісвалі тэксты прыказак, прымавак, загадак, замоў, песень. Расказвалі, што ўдалося ім запісаць ад сваіх бабуль ці знаёмых.

На аснове сабраных ведаў мы акрэслілі загаловак сцэнкі, сцэнарый якой сабіраліся напісаць. Было гэта „Дзіця — дар Бога". Пачалі пісаць сцэнарый, выкарыстоўваючы сабраныя веды. Наша сцэнка складалася з трох адслон:

I. Размова (на гаворцы) суседак аб тым, што нявестка народзіць дзіця.

II. Адведкі.

III. Хрысціны — з паказам абраду „кашы".

Я паінфармавала сваіх вучняў, што прэзентацыя нашай працы над праектам пройдзе на X Аглядзе абрадавых калектываў у Гарадку, а потым на форуме нашай школы.

Мы распісалі ролі, выбралі дзеючыя асобы. Галоўныя з іх гэта: кум, кума, бацькі нованароджанага, бабка, апошнія ўдзельнікі хрэсьбіннай урачыстасці. Як застольныя песні мы выкарысталі фальклорныя песні калектыву „Арэшкі" і „Радзінную песню" з альбома „Я нарадзіўся тут".

Мае вучні прайшлі многа рэпетыцый. Яны многа працавалі над выпрацоўкай сцэнічнага выступлення. Маладыя акцёры павінны былі паказаць абрад, якога яны самі не памятаюць. Павінны былі прадставіць важную вясковую ўрачыстасць з захаваннем яе вясёлага характару.

Самым цікавым абрадам для вучняў была „каша". У час яе „дзялення" вучні добра гулялі, а калі сабіралі кавалкі пабітай талеркі, было многа весялосці.

Падрыўтоўка сцэнкі ў форме адукацыйнага праекта многа дала маім вучням. Яны навучыліся працаваць у групе і быць адказнымі не толькі за сябе, але і за сваіх сяброў. Выступленне на сцэне патрабавала адвагі і ўмеласцей. Падрыхтоўка матэрыялу да сцэнарыя патрабавала ведаў з кніжак, а таксама ўмеласці завязаць кантакт са старэйшымі людзьмі. Мае вучні з гэтым справіліся. А вось іх прозвішчы: В. Хадакоўскі, М. Кіндзюк, Б. Кананюк, К. Карнілюк, Н. Казлоўская, Э. Кузыка, Д. Ляўчук, П. Анішчук, Ю. Сідарук, Ю. Сегень, Г. Сіроцка, А. Гацута, А. Каліноўская, І. Крышкавец, Э. Анішчук і М. Яноўская.

Думаю, што мэту, якую ставіць адукацыйны праект, мы дасягнулі. Усе вучні атрымалі шасцёркі на канец школьнага года. У іх свядомасці застанецца тое, што яны маладыя беларусы, а апрацаваны абрад гэта адзін з прыгожых і багатых абрадаў іх дзядоў і прадзедаў.

У час працы над праектам вучні адчувалі сябе свабодна. Між сабой пачалі размаўляць на беларускай гаворцы. А сёння штораз менш можна гэта пачуць.

Ніна Куптэль, настаўніца беларускай мовы ў Пачатковай школе і Публічнай гімназіі ў Дубінах

Гайнаўка

Школа для бацькоў

Псіхалагічна-педагагічная амбулаторыя ў Гайнаўцы па вул. Ю. Пілсудскага, 10 „А", запрашае ў „Школу для бацькоў". Прапануе заняткі бацькам 5-6-гадовых дзяцей, якія не ходзяць у дзетсад.

Амбулаторыя запрашае таксама ў Кансультацыйны пункт ранняга аказвання дапамогі дзеля развіцця дзіцяці, які адкрылі 1 кастрычніка г.г. Ён працуе ў кожную сераду ад 10 да 12 гадзіны. Знаходзіцца ў Раённай амбулаторыі н-р 1 па вул. Ю. Пілсудскага 10, пакой 16. Дзяжураць лагапедыст (logopeda), псіхолаг і педагог-тэрапеўт. Даюць яны парады і кансультацыі бацькам дзяцей ва ўзросце ад 0 да 16 гадоў. Бясплатна выконваюць паслугі: камп'ютэрная праверка слыху і зроку ў дзяцей і моладзі, тэрапія дзяцей з узбудлівасцю, лагапедычная тэрапія, візіты тэрапеўта ў сямейны дом дзіцяці з фізічнымі заганамі.

За дэталёвымі інфармацыямі можна звяртацца ў Псіхалагічна-педагагічную амбулаторыю па тэлефоне: 683-23-05.

(яц)

Зорка

старонка для дзяцей

Фота МІХАЛА МІНІЄВІЧА

Арэшкаўскія дзеці і настаўнікі на экскурсіі ў Белавежы

У Арэшкаве

На старонках „Зоркі” часта прадстаўляем жыццё школы ў Арэшкаве. Тут многа нашых чытачоў і аматараў конкурсаў. На працягу тыдня мы атрымоўваем пяць-дзесяць лістоў. Дзеці пішуць таксама па электроннай пошце.

Школа ў Арэшкаве невялікая — тут 46 навучэнцаў. Амаль усе дзеці ходзяць на ўрокі беларускай мовы. Родную мову выкладае Ірэна Герасімюк. У вёсцы дзейнічае фальклорны калектыў „Арэшкі”. Спявачкі выконваюць старажытныя мясцовыя песні і абрады.

Моладзь і дзеці, разам з настаўнікамі, часта ладзяць экскурсіі і краязнаўчыя вандроўкі. Найперш, як і належыць, знаёмяцца з наваколлем — з асаблівасцямі Белавежскай пушчы. Арэшкава — прыпушчанская вёска. А каб не згубіцца ў жыцці, найперш трэба спазнаць ды вывучыць сваё!

ЗОРКА

Аляксандра

Зіма неўзабаве — адляцелі ў вырай ластаўкі і жаўрукі. Здаецца — усё замёрла. Ці сапраўды так, дарагія сябры? Не зусім. Хопіць зірнуць на заснежаныя дрэвы. Хто там чыр-чыр-кае або кар-кар-кае? Хто шчабеча? Гэта птушкі, якія любяць зіму — снегіры, вераб’і, вароны.

Оля Карпюк, вучаніца Пачатковай школы ў Гарадку, выступіла з вершам М. Маляўкі „Пустыя кармушкі”.

Невыпадкова і мы напамінаем пра сімпатычнае выступленне Аляксандры — неўзабаве зіма, птушкі зноў будуць прылятаць да нашых вокнаў і кармушак.

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Міра ЛУКША

Дзікі птах верабей

Пасяліўся верабей у пустое гняздзечка,
Там, дзе ластаўка жыла. Цёпла,
як ля печкі.
Рада жонка вераб’я — не страшны
завейкі,
Пад суседняю страхой жывуць верабейкі,
Дзеткі іхныя з вясны, радаснай сямейкай.
На падворку — свежы корм для курэй
і качак,
Пры карытцы ўся сям’я вераб’іна скача.
Усё ж — не хатні верабей, хоць жыве
тут з намі.
Незалежны птах з яго. Пан ён
над панамі,
Хоча — ёсць, а калі не — хатку сабе
зменіць.
Для малога вераб’я — мора па калені.

Наша пошта

Усіх дзяцей, якія чакаюць узнагарод, ветліва паведамляем, што дашлем іх у школу, калі назбіраецца большая іх колькасць. Той, хто не можа ўжо дачакацца ўзнагароды, хай наведае рэдакцыю „Нівы” (працуем з 8 да 15 гадзіны).

Просім таксама адзначаць клас або ўзрост, бо ў выпадку калі выйграеце кніжкі, аўдыёкасеты або музычныя казкі — падбярэм іх паводле ўзросту.

Паэтцы „Барбары” шлем прывітанні — Бася, твой верш надрукуем пад „Валянцінкі”.

ЗОРКА

Францішак КАБРЫНЬЧУК

Ішоў асенні змрок

Асенні паўзмрок
напружваў свой зрок.
Сонейка злавіў у жмені,
што ўцякала ў лесу цені
ў развітанні з днём.
Іскравых вачэй кашэчых
ён не мог злавіць, дарэчы,
іскрацца агнём.

Ішоў потым змрок,
паскорыў свой крок.
Лясным гномам у хацінах
ён пазатыкаў шчыліны
восеньскай імглой.
Ды акон у гномаў хатках
не пазатыкаў ён ваткай,
ззяюць пад сасной.

Асенняя ноч
ішла ў даль і ўзбоч.
І плашча той ночы полы
прыкрывалі ўсё наўкола,
штораз больш чарней.
Аднак зорак на нябёсах
пагасіць ёй не ўдалося,
іскрацца далей.

З польскай мовы
пераклаў Віктар ШВЕД

Казкі дзяцей Беларусі

Асінка і ветрык

Жыла-была на ўзлеску Асінка. Вясёлая, шапатлівая. Быў у яе верны сябар — Ветрык. Яны часта любілі гуляць разам: Ветрык падзьме жартаўліва, а Асінка зашапаціць сваімі лісточкамі.

Аднойчы выдаўся зацішны дзень. Ветрык не змог пагасцяваць у яе лісточках. Яны не шапацелі, не радаваліся Ветрыку і Сонейку, як гэта бывала заўсёды. Асінка вельмі сумавала. І яшчэ не ведала, што чакае яе.

Раніцай паднялася над лесам Бура. Як зялёныя слязінкі, густа пасыпаліся з Асінкі лісточкі. Кінуўся Ветрык на дапамогу, ды нічым не мог дапамагчы сваёй сяброўцы.

Бура не хацела, каб Ветрык сябраваў з Асінкай. Бура зайздросціла, яна хацела, каб усе сябравалі толькі з ёю. Таму і надумала адпомсціць, зламаць Асінку.

Ды ўсё ж Ветрык не пакінуў Асінку ў бядзе. Ён прыдумаў, як выратаваць яе.

— Схавайся пад тую вялікую кашлатую Елку! — крыкнуў ён Асінцы, калі Бура на міг прыціхла. — Яна побач з табой расце.

І Асінка схавалася пад Елку. Бура яе шукала, шукала, але не знайшла. Злосная, пакінула яна ўзлесак, паляцела далей. Асінка ж вылезла з-пад Елкі і зноў пачала гуляць-забаўляцца з Ветрыкам.

Асінка і Ветрык сябравалі тады, сябруюць і цяпер.

Наташа РАМЕЙКА,
Мінская вобласць,
Мядзельскі раён, в. Купа

Кніжка-вандроўніца

Згубіла Кася кніжку. Не падручнік, бо ж ён „заўсёды пад рукой", ужо з назвы вядома. Ды ў Касі мала што не прападае! Усё пасее! Бабуля нават называе яе „Рассеянай". Добра, што кніжка была не з бібліятэкі! Але ж падарунак, ад цёці Алінкі... І не дачытала яшчэ гэтага зборніка апавяданняў Алеся Макарэвіча Кася да канца. А пад канец трапіліся найлепшыя, найбольш займальныя. Нават пра каханне! Чытала ў аўтобусе, едучы ў школу. І тут, раптам, выходзячы з салона, пакінула на сядзенні. Калі б яшчэ быў гэта аўтобус школьны, дык вядома, у каго пытацца пра згубу. А хто ў Беластоку ехаў пасля Касі? І ці ўвогуле заўважыў невялікую кніжачку! А, нават калі і заўважыў, не пацікавіўся, альбо і выкінуў, не дай Бог, у сметніцу?! Невядома! Сорамна прызнацца цёці Алінцы, што страціла падарунак. Цёця такая, што і спытацца можа, пра герояў, пра тое, ці кніжка спадабалася. Яна ж не прапусціць ніякай кнігі, нават дзіцячыя чытае, хоць ёй аж 33 гады! Чытала і гэты зборнік, „Жывая душа", спадабаўся аж да слёз, таму і падаравала яго пляменніцы...

А „Жывая душа" не прапала. Знайшла яго вучаніца ліцэя Зося. Прачытала. А пасля наклеіла на вокладцы дзве картачкі: „Згубленая кніга" і другую, большую, дзе на самым версе напісала свой электронны адрас. І дапісала, што кніжку знайшла ў аўтобусе нумар 5 у Беластоку. Пасля паклала яе на лаўку ў Звярынецкім парку, загарнуўшы яе ў тоненькі фольгавы мяшочак, каб не змокла на выпадак дажджу.

Праз тыдзень Зося атрымала электронны ліст ад пані Любы з вуліцы Антанюкоўскай. Бабуля Люба, пенсіянерка, прачытала кнігу, пачытала ўнуку, падпісалася на ёй, ды адрас унукаў дала, бо ў яго ёсць камп'ютэр, і паведаміла Зосю. А сама „падкінула" „Жывую душу" ў кавярні „Маршанд", калі была на каве з сяброўкай.

Наступны быў малады журналіст Пятро. Неяк справіўся з беларускім тэкстам (ягоны прадзед, аказалася, працаваў арганістым на Беларусі), і перадаў кнігу далей...

Праз паўгода на Касіным стале ляжаў фольгавы пакуначак. Прынесла яго цёця Алінка і з усмешкай выйшла ў другі пакой, паразмаўляць з сястрой, Касінай мамай. На ўклееных лісточках запісаны былі адрасы — і электронныя, і хатнія, людзей, якіх наведала „згубленая кніга" „Жывая душа" Алеся Макарэвіча, крышку пастарэлая.

Яшчэ раз прачытала, у гэты раз усе апавяданні. Паставіла на паліцу. А пасля выслала лісты да ўсіх чытачоў. А пасля зноў загарнула „Жывую душу" ў мяшочак і выйшла на вуліцу.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Нясвіжскі замак — від з боку заліву

Замкі Беларусі

— Ці ўжо разгадалі, які гэта замак? Так. Гэта той жа замак Радзівілаў у Нясвіжы, пра які мы пісалі тыдзень раней. Толькі зараз глядзім на яго ад „чорнага ходу" — з боку заліву. Праўда — з гэтага боку ён бачыцца зусім як не той?

Год таму ў замку ўспыхнуў пажар і цяпер ён грунтоўна рамантуецца. Турыстам пакуль нельга заходзіць усярэдзіну, кожны кружыць навокал будынка і адкрывае яго незвычайныя абрысы, вабнасць.

— А ці жыла тут нейкая прынцэса? — пытае мяне пяцігадовая сяброўка.

— Так, тут жыла адна з самых прыгожых жанчын Вялікага княства Літоўскага — Барбара Радзівіл, жонка польскага караля Сігізмунда Аўгуста.

І сёння памяць пра Барбару Радзівіл жыве ў Нясвіжы, людзі гавораць, што яе прывід з'яўляецца ў замку або ў парку ў асобе Чорнай Дамы.

Усе, вядома, баяцца сустрэчы з Чорнай Дамай, бо яе з'яўленне прадказвае няшчасце або смерць.

Зорка

Юстына

Пра любоўную гісторыю камара і мухі распавяла ў Нараўцы дэкламатарка з Гайнаўкі — Юстына Тамашук. Юстына прадстаўляла Пачатковую школу н-р 3.

А любоў паміж мухай і камаром, вядома, сам смех і ўцеха! Варта адзначыць, што матыў закаханых насякомых „хмарай" выступае ў народных песнях. Як сказала мне адна дэкламатарка, спяваць і дэкламаваць вершы пра мух і камароў найлепш тады, калі яны спяць — значыць, позняй восенню і зімой. „Несапраўдныя" насякомыя, як згаданыя героі ў вершы пад загалоўкам „Камар муху пакахаў", паводзяць сябе па-сяброўску — карацей, як нашы класныя сябры!

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Казкі дзяцей Беларусі

Дзяўчынка Песня

Была некалі дзяўчынка, у якой было незвычайнае імя — Песня. Працавітая, добрая, яна вельмі прыгожа спявала. У свята — адны песні, у сумную хвіліну — іншыя. Усе любілі яе, цешыліся, слухаючы ейны голас.

Аднойчы вырашыла дзяўчынка пайсці ў свет — людзей весяліць. Сабралася і пайшла. Дзе ідзе — там спявае, людзей вітае. Прыйшла яна ў вялікі горад. А там усе нейкія злосныя, панурыя. Пытаецца дзяўчынка ў сумнага юнака:

— Чаму ў вашым горадзе людзі не ўсміхаюцца?

— Тры гады прайшло, як на трон сеў кароль Сум, — адказаў той. — Ён усім загадаў не ўсміхацца, не гаварыць добрых слоў.

Дзяўчынка вырашыла дапамагчы людзям. Яна заспявала. Людзі, слухаючы яе, таксама заспявалі вясёлыя, жартоўныя песні.

Кароль Сум даведаўся пра дзяўчынку і паслаў слуг злавіць яе і кінуць у цямніцу. Але яна ператварылася ў жаўрука. І паляцела над зямлёй, дорачы ўсім свае песні.

Кожны год цяпер, вясной і летам, чуем мы спеў жаўрука. А ў гэтым спеве — запавет дзяўчынкі Песні:

— Не сумуйце, людзі! Радуйцеся яснаму сонейку, радуйцеся жыццю!

Лена ТАЛПЕКА, Мінская вобласць, Слуцкі раён, Селішчанская СШ

Польска-беларуская крыжаванка № 47

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 43: Торт, мова, ода, дата, шок, дар, чарадзей, анёл, слон. Год, чын, вада, татар, араб, ток, пакой.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Юстына Данельчык**, **Паўліна Паскробка** з Дубін, **Лукаш Зіневіч**, **Пётр Адамчык**, **Аня Трахімчук**, **Грышка Завадскі** з Гарадка, **Аня Рубашэўская**, **Эвеліна Гайко** з Бельска-Падляшскага, **Паўліна Чурак** з Арэшкава, **Ганя Пякарская** з Беластока. Віншуем!

Узнагароды можна ўзяць у рэдакцыі „Нівы", або чакаць іх у сваёй школе.

Фота УЛАДЗІМІРА ЛАПЦЭВІЧА

Госці з Магілёва сярод „ніўцаў”

Прыгоды дзесяці студэнтаў і двух выкладчыкаў

З Магілёва ў Беласток

Студэнты факультэта славянскай філалогіі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта, пад кіраўніцтвам дэкана факультэта Аляксея Лаўшука і Аляксандра Макарэвіча, загадчыка кафедры беларускай літаратуры правялі ў Беластоку восем працавітых дзён па запрашэнні філалагічнага факультэта Беластоцкага універсітэта. Адной з прычын прыезду была моўная стажыроўка, кожны дзень пачынаўся з заняткаў па польскай мове.

— Мы не толькі вывучалі граматыку польскай мовы, але і чыталі мастацкія тэксты, прымянялі атрыманыя веды на практыцы, — успамінаюць студэнты Валянцін Вішнявецкі і Алена Жарыкава. — Трапілі мы і на заняткі даследчыка прафесара Міхала Кандрацюка. Напачатку праслухалі лекцыю па анамастыцы на польскай мове, а пасля спецыяльна для нас прафесар перайшоў на беларускую мову, якую ён выдатна ведае. Пасля абеду звычайна праходзілі культурныя мерапрыемствы. Спачатку мы пазнаёміліся з гісторыяй Беластока, наведаўшы Гарадскі музей. Больш за ўсё нас уразіў макет горада, які перадаваў яго выгляд у XVII стагоддзі... Вельмі цікава было сустрэцца з пісьменнікамі і літаратуразнаўцамі Янам Чыквіным і Галінай Твараповіч. Паэт чытаў нам свае вершы, распавядаў аб сваім жыцці, творчым шляху. Пагутарылі і аб развіцці сучаснай літаратуры, аб творчасці пісьменнікаў літаратурнага аб'яднання „Белавежа”. На развітанне мы атрымалі ў падарунку кнігі вершаў пісьменнікаў „Белавежы”. З пісьменнікамі сустрэліся таксама ў рэдакцыі газеты „Ніва”. Віктар Швед расказваў пра сваё станаўленне як паэта, чытаў вершы, а з Мірай Лукшай у нас завязаліся цёплыя сяброўскія адносіны. Атрымалі мы ад пісьменнікаў кнігі з аўтографамі, а таксама выданні Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва”. Наведалі мы і Беластоцкі драматычны тэатр, глядзелі спектакль па рамане Фёдара Дастаеўскага „Злачынства і пакаранне”. Былі прыемна ўражаны тым, як рэжысёр Тамаш Ман перапрацаваў гэты велічны твор для пастаноўкі на малой сцэне. Была ў нас цудоўная паездка ў Бельск-Падляшскі. Там мы наведалі беларускую гімназію і ліцэй, дзе даведаліся, як выкладаецца наша родная мова на польскай зямлі, пагарталі падручнікі па беларускай мове польскага выдання, пазнаёміліся з настаўнікамі і вучнямі, прысутнічалі на ўроках. А пасля крыху пагулялі па вуліцах Бельска. Натрапілі на дом, дзе здымаўся фільм „Знахар” Ежы Гофмана. Здзівіла тое, што праваслаўных храмаў у гарадку больш, чым каталіцкіх, аднак беларускай мовы на вуліцах не чутно... Захапіў нас і Беласток, які ўяўляецца нам сапраўдным еўрапейскім горадам, дзе адчуваеш таксама подых былых стагоддзяў.

— Хочам выказаць вялікую падзяку рэктару нашага універсітэта, дэкану Аляксею Лаўшуку, прафесару Міхалу Кандрацюку з Беластоцкага універсітэта за моўную стажыроўку. Асабліва ўдзячны мы выкладчыцам Ніне Андрасюк і Аліне Філіновіч, якія зрабілі ўсё магчымае, каб мы не сумавалі ні адной хвілінкі. Заўсёды ветлівыя, шчырыя, дасціпныя, яны праводзілі для нас лекцыі, ездзілі з намі на экскурсіі, дамаўляліся і праводзілі сустрэчы з дзеячамі літаратуры і мастацтва і проста заўсёды былі побач.

(куша)

Усе дарогі вядуць у Мора

Айчыны Віктара Шведа

*Мае Айчыны** — дванаццаты паэтычны зборнік вядомага як у Польшчы, так і ў Беларусі паэта Віктара Шведа, сапраўднага песняра Беласточчыны, дзе ён нарадзіўся і адкуль выйшаў у далёкі свет, — піша аб новым (45) зборніку з Бібліятэкі Літаб'яднання „Белавежа” ягоны рэдактар Яўген Міклашэўскі. — А гэтай зямлёй ёсць вёска Мора — самая блізкая, самая родная, самая дарагая паэту.

І, як заўважае паэт Яўген Міклашэўскі, таксама родам з Беласточчыны, калі б мы нічога не ведалі ні пра гэтую зямлю, ні пра родную вёску паэта, а толькі прачыталі хаця б адну кніжку яго вершаў — гэтага было б даволі, каб мець уяўленне пра тое, як жыла і жыве Беласточчына, яе беларускае насельніцтва... Кожная кніга паэта — усхваляваны, паэтычны дзённік, напісаны пафасна, аўталагічнай мовай, якая надае вершам рэалістычную дакладнасць, жыццёвасць малюнка, праўдзівасць перажывання... Кола тэм у новай кнізе Віктара Шведа ранейшае, але прасякнута яна большым болем і смуткам, абумоўленым горкімі, непазбежнымі стратамі блізкіх і родных, сяброў і знаёмых, з кім разам, у смутку і радасці, паэт прайшоў па квеценных лугах і пясчаных узгорках свайго жыцця. Аднак пачуцця беспрасветнай безнадзейнасці кніга „Мае Айчыны” не пакідае...

Першы раздзел — „Не адракуся Беларусі”, як быццам паўтарае першыя Шведавы словы, якія прагучалі на нашай роднай Беласточкай зямлі. Ён за сябе, які назваўся беларусам, і за айчыну, і за родную мову, поўны пафасу:

Ніхто ніколі не прымусіць,
Каб я змяніў свае ідэі,
За незалежнасць Беларусі
Душой і сэрцам я хварэю.

Я веру ў несмяротнасць мовы,
У тое, што яна не згіне...

Альбо, з сумам пытаецца:

Які твой прышлы лёс, народзе,
І твой, бязвольны чалавек?

І ўздыхае:

У дваццаць першым
каб стагоддзі
Не знікнуў цалкам беларус.

Віктар Швед ставіць слушныя пытанні: *Калі ж мы станемся партнёрамі? Што нам дасць Еўрасаюз? Колькі нас? Чаму не можам жыць у згодзе? Мы ж тут не госці! Ці чуеш, як плача зямля? Чаму беларуская мова не можа быць абавязковай? Ці мне хопіць чытачоў?* Як паэта-грамадзяніна трывожыць лёс землякоў, часта адрачэнцаў ад веры, мовы і народа.

Гараць вобразы мучанікаў святых,
Што надалей праваслаўе вартуюць.
Калісьці жыўцом спалілі іх
За праваслаўную веру святую.
(Цэрквы гараць)

Супраць *адрачэнцаў* і *маўчуноў* ставіць паэт шчырых актывістаў Беларускага таварыства (*Спявай, пакуль жывеш, народзе!*), выпускнікоў і выхаванцаў Беларускага ліцэя імя Б. Тарашкевіча, канкрэтных жывых беларусаў, такіх як Кастусь Майсеня, бацькі, сваякі Ніна, Васіль, Пятро, Юрка Валкавыцкі, Алена Анішэўская, Міхась Хмялеўскі, Янка Крупа (прысвячэнні на гадавіны), увекавечвае ў развітаннях — біскупа Часлава Сіповіча, Яна Тарасевіча, Мікалая Чарнецкага, Тамару Саланевіч, Яраслава Кастыцэвіча, Янку Жамойціна, Міколу Гайдука, Яўгена Аніську, Сяргея Карніловіча. Усе яны стаяць перад намі, у дзеяннях, падзеях, жыцці. І сапраўды, рэалістычна бачым гісторыю і змены *Падляшша — айчыны нашай, з пакорай* паломнічаем з паэтам *у вёску Мора, з Богам да роднага парога*, цешымся ягонымі захапленнямі: *у кожную пару года цудоўная прырода* і кахаем, трывожна пытаючы: *Ці мяне кахаеш ты?*. Бо *не толькі ўзрост ранні падуладны каханню*. Віктар Швед, на сваё ледзь не васьмідзесяцігоддзе — такі як і быў! Верны любові да айчыны, жанчыны, усё малады беларус, паэт-трыбун!

Міра Лукша

*Віктар Швед, *Мае Айчыны*, Бібліятэка Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа”, кніга сорак пятая, Беласток 2003, сс. 114.

Беларусь — Польшча 1:1

У Мінску 15 лістапада г.г. на стадыёне Дынама адбыўся першы матч плэй-оф адборачнага турніру Чэмпіянату Еўропы. Гол для Беларусі ў 31 хвіліне здабыў Арцём Канцавы, а для Польшчы ў 64 хвіліне — Міхал Стасяк.

Юрый Пунтус, галоўны трэнер зборнай Беларусі: „Я вельмі расчараваны вынікам матча. Калі б не траўмы Глеба і Канцавога, лік на табло быў бы іншы. Не ведаю, ці гэтыя гульцы будуць іграць у матчы-рэваншы з Польшчай”.

Эдвард Кляйндынст, галоўны трэнер зборнай Польшчы: „Рэзультатам я незадаволены. Лічу, што мы заслужылі на адзін гол больш і павінны былі перамагчы”.

www.open.by

Герой ці злачынца?

3 лістапада на першым тэлеканале публічнага тэлебачання дэманстраваўся дакументальны фільм Агнешкі Арнольд „Bohater”, аб Рамуальдзе Райсе, псеўданім „Буры”. Рашэннем суда ў 1947 г. „Буры” быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. У 1995 г. яго рэабілітавалі. У Браньскай гміне ўзведзены яму помнік. У памяці жыхароў усходняй Беласточчыны „Буры” бачыцца як злачынца. Гэта ён са сваім атрадам пазбавіў жыцця вазакоў з Лазіцаў ды спаліў вёскі Залешаны і Зані.

Аўтарка фільма прыводзіць успаміны былых салдат „Бурага” і сем'яў ахвяр.

Хачу затым паставіць пытанне ў адрас Інстытута нацыянальнай памяці: як бачаць справу рэабілітацыі Рамуальда Райса і хто ён у сапраўднасці: герой ці злачынца? Факты і дакументы сведчаць аб гэтым другім. Хочацца, каб у нашай дзяржаве ўсё называлася сваімі імёнамі. Гісторыі нельга фальшаваць. Яна павінна заўсёды заставацца праўдзівай.

Уладзімір Сідарук

Нараўка

Неўзабаве адкрыюць музей

У Нараўцы рыхтуюць да адкрыцця невялікі Рэгіянальны этнаграфічны музей. Для яго гмінныя ўлады перадалі прыгожы драўляны будынак былога прадшколля. Экспазіцыю гатовіць гайнаўскі мастак Віктар Кабац. На паліцах знойдуцца, між іншым, гліняныя гаршкі і збаны, кубкі і лыжкі, калаўроткі, матавілы, маслабойкі, вышываныя ручнікі і макаткі, колішнія пакрывалы, радзюжкі і дываны. Сярод экспанатаў апынуцца старыя сельскагаспадарчыя прылады.

— Хочам адкрыць музей у канцы лістапада або ў пачатку снежня, — кажа Віктар Кабац. — Часу маем малавата, але паспеем. Гэта ж праца пад дахам. Асенняе надвор'е не будзе перашкодай. У далейшым плане намерваемся перакрыць будынак, аднавіць яго звонку.

Музей будзе даступны турыстам. Школьная моладзь будзе прыходзіць сюды на ўрокі гісторыі ды на заняткі па этнаграфіі.

(яц)

Я захапляюся беларусамі

З а. протаіерэем Міхаілам ШЛЯГАМ, настаяцелем прыхода ў Мальчыцах (павет Сырода-Шлёнска), які сёлета прабываў у Дубічах-Царкоўных, размаўляе Міхал Мінцэвіч.

— ***Раскажыце пра свае карані і жыццёвы шлях.***

— Я — сын Лэмкаўшчыны. Нарадзіўся я ў 1953 годзе ў Пшэмкаве, у былым Зялёнагурскім ваяводстве, бо туды былі пераселены, як і ўсе лэмкі, бацькі ў рамках акцыі „Вісла". Там я правёў дзяцінства і закончыў пачатковую школу. Сярэднюю школу закончыў у Зялёнай Гуры, а пасля падаўся ў семінарыю ў Варшаву. Ажаніўся (вянчаўся на Грабарцы) і прыняў духоўны сан.

Першыя чатыры гады служыў я ў Шчэцінку, у Свята-Троіцкім прыходзе; адным са святароў там быў вядомы сёння ў Бельску а. Лявонцій Тафілюк. Прыход быў рускамоўны, налічваў каля пятнаццаці сем'яў; яму падлягаў таксама філіяльны храм Усіх Святых у Баболіцах, які згуртоўваў трыццаць сем'яў, высяленцаў з Холмшчыны.

Чарговыя чатыры гады служыў я ў Кашаліне, таксама ў рускамоўным прыходзе, але там вернікі былі розных нацыянальнасцей: беларусы, украінцы і пара лэмкаўскіх сем'яў. Наступныя пяць гадоў быў у Лодзі, адкуль перайшоў у Мальчыцы, дзе служу ўжо васемнаццаць гадоў.

— ***Як жывуць праваслаўныя на захадзе Польшчы?***

— Нашы вернікі, у большасці лэмкі і ўкраінцы, прыехалі з кляймом бандэраўцаў — ворагаў тагачаснага строю. Лэмкам спачатку нельга было сяліцца па больш чым 2-3 сям'і ў адной мясцовасці. У 1947 годзе, калі транспарт з лэмкамі ехаў шэсць тыдняў на захад, людзей трымалі ў быдлячых вагонах на бакавых пуцях і ніхто не ведаў, куды іх вязуць. Вывозілі лэмкаў у чэрвені, калі палі былі абсеяны... У пасляваенны час на заваяваныя землі кінулася шмат махляроў і грабежнікаў, пакідаючы за сабою спустошаныя паслянямецкія будынкі. Лэмкі сяліліся ў дамы без акон і дзвярэй, без печак. І калі солтыс ці войт, а нават каталіцкае духавенства даведваліся, што будуць лэмкі, дык паведамлялі людзей, што да іх прыязджаюць бандэраўцы, якія спяць з сякерай пад падушкай. Так было да 1956 года.

У 1956 годзе крыху адліжыла і частка лэмкаў вярнулася на бацькаўшчыну, якую трэба было нанава выкупіць. Яшчэ сёння ў Міністэрстве маёмасных пераўтварэнняў ляжыць некалькі дзесяткаў тысяч заяў за зварот беззаконна забраных лэмкам зямель, у асноўным лясоў. Іншыя лэмкі перасяліліся ў тыя мясцовасці, дзе было іх больш, напрыклад, цяпер у вёсцы Студзёнкі каля Лібіня няма ніводнай каталіцкай сям'і. Нашы шукалі сябе, хацелі быць разам.

Лэмкі, гэта горны народ, іх Бацькаўшчына — Ніжні Бэскід. У 1920 годзе праз два тыдні існавала Лэмкаўская Рэспубліка. Лэмкі, гэта не этнічная група, гэта народ! Маем уласныя карані, культуру, пісаную мову, уласныя межы побыту і жыцця. Акно, па-лэмкаўску — выгляд, гасцінны пакой — камора, чарапіца — бродрува, жарабя — гача.

Улады не прызнавалі лэмкаўскай нацыянальнасці. Напрыклад я, калі споўнілася мне васемнаццаць гадоў, не атрымаў пасведчання асобы, бо ў апытальніку запісаў лэмкаўскую нацыянальнасць. Мне тлумачылі, што такой нацыянальнасці няма, а я спытаў, адкуль я, тады, узяўся; доўга не давалі мне дакументаў. Паны ў белых кашулях і пад гальштукамі цікавіліся таксама, чаму я вучуся ў праваслаўнай, а не іншай семінарыі. Дакладна ведалі гісторыю маёй сям'і, больш чым я сам. Было забаронена гаварыць пра этап у Явожне ў 1947 годзе. Не згадвалася таксама, што вялікая група лэмкаў праліла кроў у абарону Польшчы. Жудаснае і тое, што яшчэ сёння ў сіле дэкрэт пра акцыю „Вісла", а я быццам надалей ствараю пагрозу дзяржаве.

Я не маю нічога супраць чыіх-небудзь каранёў, але я з'яўляюся выключна лэмкам. Апрача полюсаў няма хіба такой краіны на Зямлі, дзе б не было лэмкаў. Да вайны шмат іх эміграваала, асабліва ў Амерыку. І сёння працягваецца эміграцыя ў Канаду, Аўстралію; там існуюць вялікія лэмкаўскія згуртаванні.

Пасля перасялення лэмкі на захадзе Польшчы баяліся падаваць прашэнні за заснаванне сваіх прыходаў, прадчуваючы, што такія хадайніцтвы будуць адкінуты. Было таксама патрабаванне, каб было прынамсі дзесяць сем'яў для заснавання канфесійнага пункта. У маім горадзе доўга не было царквы; толькі з пачатку 1960 года пачаў працу пастаянны пункт нашай Царквы. Нашым першым епіскапам, якога я помню, быў Вроцлаўска-Шчэцінскі ўладыка Васілій. Наш прыход быў адным з большых лэмкаўскіх у Польшчы. Маім духоўным настаўнікам быў а. Мікалай Палішчук.

У Мальчыцах не было дзесяці нашых сем'яў, нельга было адкрыць канфесійны пункт. Першая царква ў прыходзе была ў Вільчкаве і там людзі паздавалі свае гаспадаркі, каб перасяліцца ў Мальчыцы і атрымаць пасляевангеліцкі касцёл. І сёння пражывае тут дзесяць нашых сем'яў, а ў цэлым прыходзе 38. Некаторыя з іх даязджаюць па 10-20 кіламетраў. Бо прысутнасць у царкве адыгрывае трайную ролю: захаванне веры, нацыянальнай тоеснасці і сустрэчы аднакроўнікаў. Набажэнствы ў нас служацца на старацаркоўнаславянскай мове, а пропаведзі гавару па-лэмкаўску. Наша царква, колішняя евангеліцкая кірха, адна з прыгажэйшых на Захадзе, запраектаваная была выдатным нямецкім архітэктарам Гансам Пэльцыгам і ўзведзена ў 1901-1902 гадах. Пабудаваная яна на плане крыжа, іканастас прывезены з Любліншчыны, асталіся тры паслянямецкія званы (раней было пяць). Катэхізацыя, каб не ўскладняць раскладу ўрокаў, адбываецца ў прыходзе.

Фота з асабістага архіва ІРЭНЫ АДЗІЕВІЧ

Дэлегацыя Дубіцкай і Арлянскай гмін у Мальчыцах, верасень 2000 года. Айцец Міхаіл Шляга — наперадзе

— ***А што Вы скажаце пра беларусаў?***

— Я з вялікай пашанай стаўлюся да беларусаў, якія пасля 1945 года перасяліліся на захад Польшчы і з Беласточчыны, і з-за Буга. Калі б не яны, большасці нашых прыходаў не было б. Гэта яны, беларусы, ішлі ва ўстановы і прабіваліся. І калі ў адным месцы давалі дазвол на заснаванне прыхода, дык давалі і ў другім.

Вельмі расчаравалі мяне вынікі перапісу насельніцтва. Мне вельмі прыкра, што так мала людзей прызнаецца да сваіх каранёў, што зрабіла гэта толькі 50 тысяч беларусаў. Паводле мяне, гэта віна не толькі людзей, але і маіх брацціяў. Вельмі сумнае і тое, што лэмкамі, якіх у Польшчы дзесяткі тысяч, запісалася толькі шэсць тысяч: раз'ядноўваюць іх канфесіі — вялікі адсотак грэка-каталікаў, рыма-каталікаў, мешаных сужонстваў; праваслаўных, якія ў Царкву вярнуліся ў 1920 годзе, найменш. І цяпер, калі Польшча ўваходзіць у Еўрасаюз, нацыянальныя меншасці, калі не будуць пільнавацца, вельмі страцяць.

— ***А як Вы, бацюшка, пасябравалі з Дубічамі-Царкоўнымі?***

— Гэта звязана з паводкай у 1997 годзе, якая ахапіла Ніжнюю Сілезію. З блаславенства ўладыкі Іярэмія я займаўся дапамогай пацярпеўшым ад паводкі на адрэзку ад Вроцлава да Гожава-Велькапольскага. Вялікая грашовая дапамога прыйшла з Галандыі, але я асабліва цаню дапамогу з гмін Дубічы-Царкоўныя і Орля. Дапамогу атрымалі мы пад канкрэтны заказ: тое, што я прасіў, прывезлі нам у Мальчыцы вялікім кантэйнерам. І з гэтага пачалося наша знаёмства і калі на Падляшшы была засуха, я лічыў сваім даўгом аддзячыць.

Ад пару гадоў вяду абменныя летнікі між Дубічамі і Мальчыцамі. Сюды на два тыдні прыязджалі дзеці-інваліды з Ніжняй Сілезіі, у 99% католікі, якія ўпершыню пабачылі цэрквы і прыгожа ў іх маліліся. Войт бясплатна даў у наша распараджэнне школу і кухню. Пасля да нас прыязджалі дубіцкія дзеці. Працягвалася гэта тры гады.

— ***Якія Вашы планы і чаму пабудаваліся Вы ў Дубічах-Царкоўных?***

— Усё ў Божых руках. Мая царква дагледжана акуратна. Мару пра абгараджэнне царкоўнага пляца, толькі няма грошай. І хачу дачакацца пенсіі. А на старасць выбраў я Дубічы, бо хачу быць сярод сваіх; я ўжо змучаны паўсюднай польскай мовай. Мне вельмі падабаецца, як іду гайнаўскай вуліцай і людзі навокал размаўляюць па-свойму, ва ўстановах размаўляюць па-свойму. Я адчуваю сябе ў сваёй стыхіі, а гэта вельмі важнае для майго самаадчування, маёй псіхікі. А не будаваўся я на Лэмкаўшчыне, бо я ўжо не ўмею хадзіць па горах. Тут адчуваю сябе добра, навучыўся размаўляць па-тутэйшаму.

— ***Наканец хачу спытаць, як жывуць з сабою людзі ў Мальчыцах?***

— Паміж жыхарамі і паміх духоўнымі няма ніякіх разыходжанняў. Жыхары горада ганарацца, што ў іх два храмы, касцёл і царква.

Нашы лэмкі працавітыя і добра вучацца, адукуюцца. Хацеў бы я, каб так было і на Беласточчыне, каб была ўзаемная пашана.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Міхал Мінцэвіч

Змест размовы неаўтарызаваны.

Дрэвы на дарогах

Павятовае праўленне публічных дарог у Гайнаўцы не паспявае з карчаваннем кустоўя, якое разраслося ў равах паабапал дарог, між іншым, на тэрыторыі Нараўчанскай гміны.

Густыя кусты растуць паабапал шашы з Бандароў у Гайнаўку цераз Новае Ляўкова. Дарожная служба не спраўляецца з сечкай кустоў і дрэў у прыдарожных равах з Нараўкі ў Звадзецкае.

Гэтаксама вялікія кусты выраслі на абочыне дарогі з Новага Ляўкова ў Лешукі (дарога бяжыць цераз лес).

Кусты вербалозу „выйшлі" на дарогу, якая вядзе з Семяноўкі ў Семенякоўшчыну. Пры добраўпарадкаванні яе дапамогуць гмінныя ўлады. Усё гэта дзеля таго, каб дарогі былі больш бяспечныя ды прыгожыя.

(яц)

Новае аснашчэнне бельскіх пажарнікаў

Бельскае староства цікавіцца пакупкай цяжкай выратавальна-гасільнай машыны для Павятовай пажарнай каманды ў Бельску. Дзеля гэтага яно выказала гатоўнасць далучэння да праграмы „Аснашчэнне выратавальна-гасільных часцей Дзяржаўнай пажарнай аховы Падляшскага ваяводства ў машыны з навейшымі апаратыўна-тэхнічнымі параметрамі". Цана такой машыны — 600 тысяч злотаў. Управа Бельскага павета павінна абавязацца да прыняцця на павет часткі гэтага кошту і адвесці адпаведныя грашовыя сродкі ў павятовым бюджэце. Управа хоча прыцягнуць да супрацоўніцтва ў гэтым мерапрыемстве гмінныя самакіраванні дзеля фінансавай падтрымкі імі інвестыцыі.

Міхал Мінцэвіч

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Фелікса і Яўген Садоўскія (злева) ды Сафія і Мікалай (ніўскі карэспандэнт і паэт) Лук'янюкі

У гміне — як у радзіне

Паўстагоддзя разам

Дзесяці парам ды іх родным яшчэ раз зайгралі Марш Мендэльсона ў нарваўскім загсе. Медалямі і граматамі за трывалае сужонства ўшанаваў іх прэзідэнт краіны Аляксандр Кваснеўскі. Не аднаму з сабраных закруцілася сляза ў вачах, а войту Нарваўскай гміны ламаўся голас, тым больш што і ён — юбіляр (паўстагоддзя ад дня нараджэння). Уручаў граматы і прышпільваў медалі да стомленых, хоць шчаслівых грудзей юбіляраў сам падляшскі віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч. З дзесяці пар на ўрачыстасць прыбылі сем — Сафія і Мікалай Лук'янюкі з Бялкоў, Фелікса і Яўген Садоўскія з Адрынок, Вера і Міхал Філіповічы з Гарадзіска, Ганна і Мікалай Ніканчукі з Гарадзіска (найбольш людная сямейка на ўрачыстасці), Люба і Мікалай Хадакі з Ласінкі, Надзея і Аляксандр Раманюкі з Ласінкі, Ніна і Міхал Астроўкі з Трасцянкі. Ушанаваны яшчэ Марыя і Сяргей Раманчукі з Адрынок, Ніна і Сяргей Ахрымюкі з Крыўца ды Люба і Міхал Мінько з Ласінкі. Узнялі ўсе разам з ваяводам сімвалічны келіх шампанскага, селі з сямейкамі за гмінны стол з пачастункам. Паліліся ўспаміны. Бліскалі фотаўспышкі, стракацелі камеры — здымалі сваіх бацькоў дзеці і ўнукі. Вясельных здымкаў найчасцей у гэтых пар няма; пасля вандроўныя фатографы майстравалі ім з маленькіх здымачкаў „манідла" — шлюбны вялікі здымак. Юбіляры ў гэты раз — у колеры, з раднёй ды ўладамі, немаладыя ўжо, хоць „маладыя". Спачатку пад песню „Wielka miłość", „якой застануцца верныя назаўжды", пасля беларускія народныя гіты... Дома чакала іх вясельнае застолле. Хоць не ўсім радасць — здараюцца трагедыі, і былі пары ў чорным адзенні, якім сум з радасцю ўперамешку, як у жыцці...

Была нагода таксама і для іншай радасці. Узнагароджаны быў прэзідэнтам Бронзавым крыжам заслугі Андрэй Асташэўскі, працавіты нарваўскі бізнесмен, які і працу дае жыхарам гміны, і падмацоўвае грамадскія ды культурныя пачыны, якога цэніць і Царква (ён — кавалер Ордэна Марыі Магдаліны).

Былі словы ўшанавання для шаноўных, але і канкрэтныя абяцанкі. Старшыня Рады гміны Яўген Дудзіч прыгадаў пра тое, як гміна дбае пра сваіх мафусаілаў, каб жылося ім лягчэй. Каб былі вада, газ і іншыя выгоды. Каб адно толькі здароўе! І гэтага найбольш жадаем юбілярам — моцнага здароўя! І сямейных радасцяў. Каб праўнукаў дачакаліся, і тых праўнукаў пажанілі! — як пажадаў ім Ежы Паўяновіч.

Была і нагода пагаманіць пра палітыку.

— Ну, то наступным разам свайго „выстаўляйце"! — паддаў духу па-свойму віцэ-ваявода. Ёсць з каго выбіраць!

Міра Лукша

Дзе шукаць дапамогі?

Бяруцца маразы. Як штогод, адчуваюць іх найбольш бяздомныя. Колькі іх у Падляшскім ваяводстве, ніхто не ў змозе палічыць. Шмат іх перамяшчаецца па тэрыторыі ўсяе краіны. Паводле даных Падляшскай ваяводскай управы, у рэгіёне пастаянных месцаў на начлег для бяздомных — 380, з чаго ў палове лістапада было свабодных блізка 150. Асаблівай дапамогі патрабуюць таксама галодныя, якіх лік, згодна з ацэнкамі, з кожным годам узрастае.

Найлепшая сітуацыя з начлегамі для бяздомных — у Беластоку. Знаходзіцца тут Дом для бяздомных мужчын (вул. Сянкевіча, 81/9), які распараджаецца 51 месцам. На жаль, у апошні час былі там толькі 2 свабодныя месцы, хоць дырэкцыя дому заяўляе, што кожны патрабуючы будзе прыняты. Падобны дом пад гэтым адрасам ёсць і для жанчын. У ім — 16 месцаў, з якіх сем у апошні час занятыя. У сваю чаргу Праваслаўны асяродак Беластоцка-Гданьскай епархіі (вул. св. Мікалая, 5, тэл. 742 65 00) распараджаецца 10 месцамі (пункты ў Трасцянцы і Кожыне; асяродак выдае таксама зімой гарачыя стравы, адзенне і харчовыя пачкі), Пенітэнцыярнае таварыства „Патранат" (вул. Свянтаянская, 2 А) — 23, і Дом маці і дзіцяці „Назарэт" — 10 месцамі.

Падобныя прытулкі даюць асяродкі ў іншых паветах рэгіёна. Найбольш месцаў прапануе Падляшскі цэнтр дапамогі бліжняму „Маркот" у Гарбасе (гміна Філіпаў) — 160. Амаль заўсёды трымае ён пару свабодных месцаў.

Горш з начлегамі для бяздомных — у паветах усходняй і паўднёва-ўсходняй часткі Падляшскага ваяводства. Толькі ў Браньску (гміна Бельск-Падляшскі) ёсць два свадобныя месцы ў Доме сацыяльнай дапамогі па вул. Яна Паўла II. У самім Бельску інфармацыю аб установах, якія даюць дапамогу, дае Павятовы цэнтр дапамогі сям'і (тэл. 730 38 34). Адзін раз гарачую страву бяздомным і галодным гарантуе Гарадскі асяродак сацыяльнай дапамогі па вул. Казімежоўскай, 18/3.

Бяздомныя не маюць таксама дзе пераначаваць у Гайнаўцы, дзе часовую дапамогу дае Дом міласэрнасці „Самаранін" (вул. 3 Мая, 62), аддзел дыяцэзіі „Карытас" (вул. кс. Сцягеннага, 3), Гмінны асяродак сацыяльнай дапамогі (вул. Аляксея Зіна, 1) і Гарадскі асяродак сацыяльнай дапамогі (вул. Пілсудскага, 4). У Сямятыцкім павеце каля 40 страў у дзень дае сталоўка „Карытас" Драгічынскай архідыяцэзіі ў сталіцы павета (вул. 11 Лістапада, 35 А), а бясплатна рэалізуе рэцэпты для ўбогіх аптэка „Карытас" у Драгічыне (вул. Касцельная, 10).

Хоць таксама няма прытулку для бяздомных, дык найлепшая сітуацыя ў гэтай частцы рэгіёна наконт дапамогі патрабуючым — у Сакольскім павеце. Дзейнічае тут „Сакольскі лакальны фонд" (вул. Касцюшкі, 9), які выдае адзенне, пледы, пасцель, а ў выпадку патрэбы — харчы, і раённая ўправа Польскага чырвонага крыжа (вул. Пілсудскага 8, пакой 42), якая прапануе часовую дапамогу і інфармуе аб бягучай сітуацыі ў асяродках дапамогі. Да таго ў Сакольскім павеце дзейнічае шэсць станцый „Карытаса", якія м.інш. апякуюцца хворымі ў іх дамах. Працуюць яны ў Крынках (вул. Гродзенская, 40), Шудзялаве (вул. Гурная, 4), Кузніцы-Беластоцкай (вул. Сакольская, 5), Сідры (вул. Сакольская, 31), Новым Двары (вул. Сідранская, 8) і самой Сакольцы (вул. Бранеўскага, 22). (холм)

З Арлянскай гміны

Новы намеснік старшыні Рады гміны

9 кастрычніка г.г. на надзвычайным пасяджэнні радныя адклікалі Ірэну Рэнгайла з пасады намесніка старшыні Рады; за адкліканне галасавала 9, а супраць 5 радных. У абаснаванне прапановы адклікання намесніцы хадайнікі напісалі, што яны „адмоўна ацэньваюць яе супрацоўніцтва з Радай; да таго ж яе паводзіны ўводзяць у працу Рады шмат беспарадку, што ў сваю чаргу выклікае разгубленасць працаўнікоў Гміннай управы. Акрамя гэтага, нягледзячы на вынік законных выбараў, яна вядзе змаганне супраць легальна абранага войта, што не прадвяшчае добрага супрацоўніцтва органаў самакіравання і пагражае выкананню гмінных задач".

Новым намеснікам старшыні Рады гміны абраны Антон Голуб з Дыдулёў, за якім прагаласавалі 10 радных.

Міхал Мінцэвіч

У Сухавольцах

Сухавольцы, што ў Кляшчэлеўскай гміне, вёска немалая, налічвае сто гаспадароў. У шасцідзесятыя гады заваявала яна першае месца ў ваяводстве ў конкурсе „Гаспадарная і культурная вёска". Памятаю як сухавальчане будавалі мураванкі. Мода такая настала. Сусед ад суседа не хацеў горшым заставацца. Дружны народ у Сухавольцах. У грамадскім пачыне збудавалі святліцу і чыгуначны прыпынак. Ініцыятарам пабудовы прыпынку быў Сяргей Галёнка, працаўнік сельскагаспадарчай службы Кляшчэлеўскай гміны.

— За прыпынак пачалі хадайнічаць у 1975 годзе, — успамінае мой суразмоўца. — У Варшаве ў Цэнтральнай дырэкцыі я парогі абтаптаў. Пяць гадоў нястомна намагаўся. У 1980 годзе атрымаў станоўчы адказ. 13 снежня 1981 г. у дзень аб'яўлення ваеннага становішча мы стварылі Грамадскі камітэт пабудовы прыпынку і пачалі вазіць пясок для ўсыпання перонаў. Пустакі самі рабілі для пачакальні, — працягвае спадар Галёнка. — Атрыманыя грошы (як узнагароду ў конкурсе за першае месца) 400 тыс. зл. прызначылі для гэтай справы. З добраахвотных складчын сабралі 100 тыс. У 1982 годзе здалі ў карыстанне прыпынак.

Карысталіся прыпынкам больш дваццаці гадоў. Зараз сэрца шчыміць ад болю. Руіна з пачакальні засталася. Печ разабралі. Вокны і дзверы вырвалі. Нават табліцу з надпісам, што будавалася ў грамадскім пачыне абарвалі. Трансфарматар з электрычнай лініі ўкралі. Зараз страшна ўвечары цягніка чакаць. Што пры камуне зрабілі, дык пры дэмакратыі разбурылі...

У Сухавольцах яшчэ трымаецца жывёлагадоўля. Сенажацей і пашаў у наваколлі хоць адбаўляй.

— Шэсцьдзесят кароў налічыць можна, — канстатуе Сяргей Галёнка. — Малако ў вясковую злеўню носім. Кожны другі дзень аўтацыстэрна забірае. Да нашай вёскі прывозяць малако з Сакоў, а нават з Маліннікаў. Як будзе пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз, цяжка сказаць, — кідае ў заканчэнні гаспадар. — Я не аптыміст і не спадзяюся папраўвы сялянскай долі.

Уладзімір Сідарук

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

З месячнага боку

Дарагая Домна! У сне была я ў чужым горадзе з маім малым сынам і мамай. У сына былі ключы да майго дому. Знайшоў ён вялікае пухнатае птушаня, якое змянілася ў малога леапарда. Я злякалася, тым больш, што блізка апынулася леапардзіха. Я зрабіла сыну здымак з леапардамі (звяры прыгожыя, вялікія, пухнатыя, вельмі прыязныя). Пасля я зразумела, што мы ў Беластоку, у ваколіцы вул. Касцельнай. Мама з маім сынам кудысьці зніклі, а ў руцэ я трымаю ключ да маёй кватэры.

Кружу па ваколіцы, клічу маму. Пасля бачу, што вядзе яна двое дзяцей — дзяўчынку ва ўзросце 14 гадоў і пяцігадовага хлопчыка. Пытаюся, дзе падзяваліся і дзе мой сын. Мама паказвае на хлопчыка (ён мала падобны і мае залацістыя валасы), а дзяўчынка гэта мая дачка Анелька (у мяне няма больш дзяцей у рэальнасці). Не памятаю моманту, калі мы разышліся. Бачу, што яны з маёй малодшай сястрой. Сястра тлумачыць мне, што прайшло 5 гадоў за той час, калі я іх шукала. А дзе тое маё, што пражыла я ў той час?! — крычу і прабуджаюся. Марынка

Дарагая Марынка! Не здзіўлаюся, што цяжка табе зразумець сон адразу, асабліва таму, што паяўляюцца ў ім асобы, якіх няма ў рэальнасці ў тваім жыцці: сын са светлымі валасамі і дачка Анелька. Можа, здзівіць цябе гэта, але кожная з гэтых асоб, якія табе прыснілісся, гэта ты сама. У сне расказала ты гісторыі сама аб сабе. Можам іх падзяліць на дзве часткі. Першую канчае момант, калі ты на вуліцы Касцельнай і гэта пачатак другое аповесці. У абедзвюх частках паяўляецца твая мама. Так як у жыцці, маці — мудрая асоба, якая дбае, каб дзіця расло і стала спелым, разумным чалавекам. У цябе ў псіхіцы ёсць такая маці — твой праваднік, які стараецца вывесі цябе з цяжкіх сітуацый, бо хоча для цябе добра. Часам робіць штосьці, што табе спачатку не ёсць зразумелым, але, у выніку, вучыць як спраўляцца ў жыцці. Важна, што ты ў сне таксама маці — маеш пад апекай дзяцей. Так як маці была тваім псіхічным апекуном, так сын, а пасля пара дзяцей — часткі твае асобы, якімі ты ў нейкі спосаб павінна апекавацца. Пакуль чалавек жыве, кожны мае ў псіхіцы такія „ўнутраныя" маці і „дзіця" (...). Магчыма, што ты чагосьці аб сабе даведалася, не таго, што пра цябе кажуць, а што ведаеш аб сабе.

На сваёй „сцежцы самапазнання" закрыла ты адзін этап, але не ведаеш, што значыць чарговы. Усё шукаеш „ключа" да самой сябе. Заўваж, што ён у цябе, калі канчаецца першая гісторыя. Расказвае яна аб даспяванні. Штосьці ў табе расло — з малога пісклянці вырас прыгожы леапард. Гэта вельмі моцныя, драпежныя звяры. Ці і ты не хацела б быць такая хоць на момант? Калі сняцца пухнатыя звяры — птушкі, леапарды — гэта эратычныя знакі.

Тое, што адкрываеш, зрабіла цябе мацнейшай. Спачатку баялася, але прыручыла страх (мілыя леапарды на здымку). Аказалася, што гэта ўпрыгожыла і ўзмоцніла цябе ўнутры. Памагаюць табе маці і сын. Важнейшае тут дзіця, хтосьці, хто, хоць слабы, выклікае тваю змену. Ва ўзнагароду атрымліваеш ключ, якім можаш адчыніць другі этап жыцця, падарожжа па тваім новым псіхічным абшары, якога да гэтай пары ты ў сабе не ведала. На канец сну пытаешся сама ў сябе: што я перажыла? У гэтым таксама ключ. Але часта чарговыя дзверы адчыняюцца толькі тады, калі мы тое што пражылі, усведамляем. Важны не сам вопыт, але і яго зразуменне.

Домна (domnason@wp.pl)

Бабры падгрызаюць дзяржаўны бюджэт

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Бюджэт дзяржавы штораз больш абцяжараны выплатай кампенсацый за шкоды, якія бабры наносяць сельскай гаспадарцы. Паводле неафіцыйных даных у паўночна-ўсходнім рэгіёне жыве каля 12 тысяч баброў, што складае 90% ад іх ліку ў краіне. Так было і даўней, калі Бебжа называлася Бобрай.

Калісь бабры высока цаніліся, асабліва з-за футра. Бабровы хвост („плюск") быў выдатным смакоццем, асабліва ў манастырах, бо — пакрыты луской — лічыўся рыбай, прыдатнай для спажывання ў час посту. У Вялікім княстве Літоўскім службовыя асобы, якіх называлі бабрыўнікамі, вялі руплівы нагляд за гадоўляй і лоўляй баброў. У палове XIX стагоддзя баброў на нашай тэрыторыі выбілі, а засялілі іх зноў у 1955 годзе. Яшчэ сем гадоў таму было іх не больш за 900, а цяпер іх лік мяркуецца на 15 тысяч (паводле некаторых — на 25 тысяч). Беспаспяховым сродкам абмежавання іх прыросту аказалася праграма яго аховы, распрацаваная Польскай акадэміяй навук і Паляўнічым саюзам, якая прадугледжвала яго перасяленне ў заходнюю і паўднёвую частку краіны. Бабёр з'яўляецца вельмі пладаносным грызуном і дзякуючы ахове яго лік неабмежавана расце, а тэрыторый для перасялення штораз менш.

Бабры з'яўляюцца вельмі працавітымі звяркамі. Будуючы хаткі і запруды ссякаюць дрэвы, часта тоўстыя, што прыводзіць да залівання лясоў і сенажацей і ў выніку — да іх руйнавання.

Падляшскі ваяводскі захавальнік прыроды хоча падлічыць падляшскіх баброў. З леснікамі, паляўнічымі і працаўнікамі нацыянальных паркаў абмяркоўваў, як гэта зрабіць і як абмежаваць наношаныя бабрамі сельскагаспадарчыя шкоды.

* * *

Паляўнічы гурток „Цецярук" у Кляшчэлях налічыў на сваёй тэрыторыі 16 штук баброў. У Арлянскай гміне бабры асабліва ўпадабалі сабе рэчкі Белую паблізу Маліннік і Арлянку каля Кашалёў, Орлі і Міклашоў. На многіх адрэзках рэк бабры ссеклі надбярэжную асіну, будуючы запруды і хаткі; калі ніхто не будзе ім перашкаджаць, навесну трэба спадзявацца маладых бабранят. Дзеля засцеражэння ад баброў у выніку хадайніцтва сялян Ваяводская ўправа згадзілася пашырыць русло Арлянкі з боку Рудутаў; на як доўга хопіць гэтых мер — час пакажа.

Міхал Мінцэвіч

Сесія ў Нараўцы

29 кастрычніка г.г. адбылася сесія Гміннай рады ў Нараўцы. Дэпутаты абмеркавалі шырокі дыяпазон спраў. Сесію вёў старшыня Гміннай рады Славамір Кулеша. Удзельнічала 14 дэпутатаў і солтысы паасобных вёсак, а таксама кандыдаты ў судовыя засядацелі.

Войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч паінфармаваў аб кадравых прызначэннях. Гмінны асяродак культуры ўзначальвае выконваючая абавязкі дырэктара Анна Стульгіс, Гмінны асяродак спорту і адпачынку — в. а. дырэктара Зінаіда Каліноўская, а Гмінны асяродак сацыяльнай дапамогі — ад 1 лістапада г.г. в. а. кіраўніка Альжбета Патонец.

Гмінныя ўлады купілі спецыялістычны самаход для ратавання людзей пацярпеўшых у дарожных аварыях і перадалі яго мясцовай добраахвотнай пажарнай камандзе. Узялі ў маёмасць гміны Гмінны асяродак здароўя разам з жылымі кватэрамі ў Нараўцы. Перадало яго Павятовае староства ў Гайнаўцы.

Цяпер у Нараўцы будуюць новы дах на тамашнім дэпо. Неўзабаве адрамантуюць дах будынка былой школы ў Альхоўцы. Будзе даведзены электрычны ток на пляж на Семяноўскім вадасховішчы ў Старым Двары. Новы фасад атрымае будынак Пачатковай школы ў Семяноўцы. Новае электрычнае асвятленне атрымае Старое Ляўкова ў рамках рээлектрыфікацыі.

У бліжэйшых планах прадбачваецца пабудова каналізацыі ў вёсцы Плянта ды водаправоднай сеткі на хутарах Новага Ляўкова і Семяноўкі.

Да высечкі прадбачваецца 94 таполі побач гмінных дарог ды добраўпарадкаванне равоў пры дарозе з Семяноўкі ў Семенякоўшчыну (ліквідацыя зараснікоў).

Падчас сесіі выбралі судовых засядацеляў: Вольгу Савіцкую, Валянціну Пацэвіч, Мікалая Герасімюка, Янку Целушэцкага і Лілю Тарасевіч.

(яц)

Залатыя лаўры для Чаромхі

23 кастрычніка 2003 года ў Варшаве аб'яўлены вынікі конкурсу „Лаўры самаўрадавай адукацыі", арганізатарамі якога былі Фонд развіцця лакальнай дэмакратыі і самаўрадавы часопіс „Вспульнота". У катэгорыі гмін і мястэчак са штатамі да трыццаці чыноўнікаў першае месца і залатыя лаўры былі прызнаны Чаромсе. Капітул, абмяркоўваючы заявы трыццаці пяці гмін, звяртаў увагу на самаадукацыю і ўдзел у прафесіянальным абучэнні. Паводле журы конкурсу ў Чаромхаўскай гміне найбольш адукаваных кадраў.

— Вучыцца ніколі не позна, — сказала сакратар гміны Валянціна Кердалевіч. — Амбіцыяй нашых працаўнікоў з'яўляецца атрыманне вышэйшай адукацыі і звання інжынера, магістра ці ліцэнцыята. Але не толькі. У рамках самаадукацыі большасць працаўнікоў пачала вывучаць англійскую мову. Разумеецца, з думкай аб Еўрасаюзе. Шчыра прызнаюся, што мы нічога асабліва не рабілі па-за службовымі абавязкамі. Сістэматычна ўдзельнічалі ў прафесіянальным абучэнні. У час трансфармацыі змянялася шмат законаў. У большых самаўрадах працаўнікам лягчэй. Яны адказныя за вузкія ўчасткі работы. У малых гмінах працаўнік практычна павінен ведаць усё. — Вялікай дапамогай, — працягвае мая субяседніца, — з'яўляюцца прафесіянальныя курсы. Але гэта абцяжарвае гмінны бюджэт дадатковымі коштамі (100-120 зл. за 8 гадзін). Таму карыстаемся адно неабходнымі формамі дасканалення кадраў.

Залатыя лаўры самаўрадавай адукацыі для Чаромхаўскай гміны гэта не толькі гонар. Гміна будзе карыстацца пятнаццацціпрацэнтнымі льготамі для ўдзельнікаў курсаў.

— Невялікія гэта будуць грошы, — прыкмячае сакратар гміны, — але сама сатысфакцыя атрымання ўзнагароды забавязвае нас да сістэматычнай і самаахвярнай працы на карысць грамадства.

Уладзімір Сідарук

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2004 r. upływa 5 grudnia 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

„Ten dom jest wspaniałym pomysłem na to, co robić w biednych gminach...” (болей „памыслаў” на 3 стар.)

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Уваходзіць дырэктар, заглядае ў свой кабінет і адварочваецца да сакратаркі:

— Пані Моніка! Я на сёння склікаў сход у свой кабінет. Ці нікога з тых прыдуркаў, маіх намеснікаў, яшчэ не было?

— Не: пан дырэктар першы.

* * *

Гутараць дзве сакратаркі:

— Учора я мела прыемнасць пазнаёміцца з тваім дырэктарам.

— І ты гэта называеш прыемнасцю?

— Безумоўна! Узрадавалася, што ён не з'яўляецца маім загадчыкам.

* * *

У тэатры спозненая пара шукае свайго месца. Ён звяртаецца да сядзеўшага з краю мужчыны:

— Прабачце, ці гэта не вам наступіў я на нагу, калі выходзіў пасля першай дзеі?

— Мне.

— Маруся, — кліча партнёр, — ідзі сюды, гэта наш рад!

* * *

— Ці маглі б вы размяніць мне сто долараў, сэр? — пытае на вуліцы адзін прахожы другога.

— Гэта немагчыма, але дзякую за камплімент.

* * *

У міністэрства ўнутраных спраў прыходзіць нованазначаны міністр і наведвае дзеля азнаямлення ўсіх працаўнікоў.

— Вы чым займаецеся? — пытае аднаго са служачых.

— Работа ў маім аддзеле так засакрэчаная, што да гэтай пары нават я не ведаю, што тут раблю.

* * *

У лекара:

— Што вам дакучае? — пытае псіхіятр хворага.

— Не магу глядзець рэклам у тэлебачанні.

— Не турбуйцеся, не толькі вы, я таксама.

— О! То і ў вас няма тэлевізара?

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. палосы драўніннай кары, з якіх плятуць лапці = 25 __ 28 __ 16 __ 20 __;
2. спіс, пералічэнне = 13 __ 21 __ 5 __ 6 __ 17 __ 18 __ 12 __;
3. рымскі пракуратар Іудзеі і Самарыі, які ўмыў рукі = 22 __ 2 __ 1 __ 26 __ 9 __;
4. рад пакаленняў, якія паходзяць ад аднаго продка = 23 __ 8 __ 27 __;
5. любіць ваду і псуецца з галавы = 14 __ 24 __ 7 __ 15 __;
6. парашок з кары хіннага дрэва, які скарыстоўваецца для лячэння малярыі = 3 __ 4 __ 19 __ 11 __ 10 __.

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 40 нумара

Восень.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Антону Казлоўскаму** з Калодна.

Людзьмі звацца

Звоніць мне мая жонка з Амерыкі:

— Дарагі мой чалавеку! Засумавала я за табою. Хочаш, прыязджай. Не хочаш — не прыязджай, але кажу, каб ведаў, што патрэбны мне сапраўдны мужчына пры маім баку.

І паклала трубку. А ты, чалавеча, думай што хочаш. Едзь — не едзь. А што з сучкаю? Браць Гарэшку ў далёкае падарожжа? Не пакіну ж яе на паняверку сярод чужых ці нават у сабачым гатэлі *на ўчасы*. А што будзе, як там, у той далячыні, вазьму ды памру? Як казала Віслава Шымборская ў вершы: *Таго кату (сабаку) не робіцца!* А раптам зваліцца мой самалёт у акіян? І Агата возьме дый не вернецца, і што тады наша старая рудая сучка падумае ды зробіць? Пакінутая адна ў няшчырым свеце, дзе для старых месца няма, будзь ты псом, канём ці чалавекам! Не, куды я б не ехаў, не кіну яе!

— Ну, едзь, — уздыхнуў Коля. — Яксьці дамо сабе рады без цябе тутака ў гэтым панурым Беластоку. Дарэчы, жывем жа ў глабальнай вёсцы. Звязацца можна ў адну секунду. Адно што віртуальная чарачка не так смакуе як сапраўдная...

— Ну, кінь ты, Міколка, пра такое. Хто падумае, што толькі адно цябе цешыць! — Збышка ўжо браўся за гітару і брынкнуў першыя, мінорныя акорды. Калі ўжо яму ўспамінаецца пра Дніпр шырокі, будзем калывацца ўсе ў суме, цяжка ўздыхаць з чырванеючымі вачыма. Няма больш сантыментальных хлопцаў, чым мы, славяне!..

— Пашпарт мой несапраўдны...

— Як „несапраўдны”? Ты ж, Вандал, сапраўдны! — ушчыпнуў мяне Коля пад бок.

— Ну, няважны. І візу трэба, — я выразна быў спалоханы: а раптам Агата сапраўды пачне шукаць „сапраўднага мужчыну” дзе сярод іншатварых, іншацелых ды іншаідэйных! А-ёйкі!

— А там, у пашпарце, нумар вам, Вандал, паставяць, — МакХолад паглядзеў на мяне з увагай. Калі ён так на мяне глядзіць, ёсць у яго на гэта прычына. Мабыць, раздумваў над чымсьці, пакуль наведаў мяне гэты наш малады прыяцель.

— А што? Трэба ж нумар... І серыю... Увесь свет так запраграмаваны, каб усё было ў парадку. Не злічылі б насельніцтва зямнога... — мяркую, а халадок прабягае мне па спіне. Не ведаю, чаму.

— Група праваслаўных вернікаў з Магілёва, чуеце, у новых беларускіх пашпартах заўважыла д'ябальскую руку, — кажа памаленьку МакХолад, і з таемным выглядам сягае па шклянку, узіраецца ў яе, быццам там убачыў твар Благога.

— Ну? Нейкая апакаліптычная ў цябе гавэнда!

— Ага. У Магілёве з гэтай прычыны 17 асоб звярнулі іх міліцыі, а чарговых 12 напісалі заявы, што не хочуць новых пашпартоў. Вернікі, на чале з мясцовым лекарам-псіхатэрапеўтам, пратэстуюць такім чынам супраць упісвання ў пашпарты эвідэнцыйных нумароў. Той псіхатэрапеўт, дарэчы, Мікалай Лайша, лічыць, што такі нумар прыніжае гонар імён чалавечых, якія яны атрымалі на хрышчэнні. Пратэстуючыя напісалі прашэнне ў пашпартны стол, каб выдалі ім пашпарты без нумароў.

— Мабыць, гэта шок для чыноўнікаў?

— Вядома, тлумачацца, што новыя беларускія пашпарты згодныя з міжнароднымі стандартамі... — МакХолад сеў на свайго ўлюбёнага канька — палітыку ды міжнародныя справы.

— Э, там, словы вучоных дурняў, — няведама адкуль сказалася Збышку, які надалей дзвэнкаў на струнах. — Найважнейшае — людзьмі звацца.

— То што, ехаць мне, ці не ехаць у той Вавілон? — маё пытанне прагучала рытарычна. Хлопцы заплакалі ад енку Дняпра. Славяншчына!..

Вандал Арлянскі

Мядзвіягра

— Наш самцовы патэнцыял зусім не горшы за нейкі там у іншых лясах. Я сам — таму прыклад, — мядзведзь Сандар Жоржавіч пачаў чарговы сход уселяснога кіраўніцтва, шматзначна спаглядаючы на лань Гаўрусіху. Тая сарамліва затрапятала доўгімі, какетліва ўзнятымі вейкамі.

— Ведаем, аднак, што не ўсе спраўляюцца як трэба, — працягваў сваю думку Жоржавіч. — У іх праблема з уласным патэнцыялам, а ў выніку пакутуе ад гэтага патэнцыял усяго нашага лесу.

Барсук Барушчук з сорамам апусціў галаву — дапяў, што пра яго можа быць гаворка. Нядаўна пакінула яго Барушчыха. На развітанне, выводзячы з нары амаль увесь запас сабраны на зіму, кінула барсуку проста ў морду:

— Ты мяне расчараваў. Немагчыма разлічваць на твой патэнцыял. Бывай!

Цяпер, у час уселяснога сходу, гэтыя словы гучалі ў апушчаных вушах барсука яшчэ больш пякуча і моцна. Мядзведзь ведаў, што здарылася ў барсуковай нары. Заўважыў ягоную збянтэжанасць, якая прабівалася на барсукову пысу:

— Наша велічнасць, як заўсёды, так і цяпер прыходзіць з дапамогай. Наша знакамітая вучоная сава Сава вынайшла сродак. Але сама аб ім скажа.

Сава, неспадзявана для кіраўніцтва, незаўважна апусцілася з сасны:

— Гу-га! — выказалася на прывітанне, крыху санліва, пасля цяжкай начной працы над новым, уваскрашаючым лясны патэнцыял прэпаратам. — Вось, раздумвала я, раздумвала, і прыдумала. Пасля эксперыментавала. І, вось, атрымалася. І маем мы ўласны прэпарат дзеля ўзмацнення лясного патэнцыялу.

— Эўрыка! — вырвалася барсуку.

Заяц Генік падумаў:

— А раптам і я патрачу сілы, дык і мне прыдасца! — і гучна выкрыкнуў: — Геніяльна!

Вавёрка Кацюша ў сваю чаргу на знак радасці ад навуковых дасягненняў савы Савы стукнула арэхам аб арэх.

— Ну, так, але патрэбная назва гэтаму сродку. Нейкая іншая за тыя, што ў заходніх лясах вырабляюць, — запрапанаваў мядзведзь.

Азваўся да пякучасці лаяльны ў адносінах да Жоржавіча, звычайна праседжваючы на дубе, дзяцел Стукач:

— Трэба, каб назва адклікалася да патэнцыялу вашай велічнасці. Хай яно завецца мядзвіяграй.

— Захапляльна! — крыкнула вавёрка.

— Я б сказала, узбуджальна! — уздыхнула з прызнаннем лань Гаўрусіха.

— Ну, дык хай так і будзе.

Гэтым і закончыўся чарговы сход уселяснога кіраўніцтва. Сандар Жоржавіч вярнуўся ў сваю бярлогу. Задыхаючыся ад гонару, стаў укладвацца да сну. Патэнцыял відавочна разрастаўся яму ад гордасці з чарговага дасягнення велічнасці ягонай і вернай яму лясное браціі.

МакХолад

ISSN 0546-1960